ПАДПІСАНЫ ЎКАЗ «АБ ПУСТУЮЧЫХ І СТАРЫХ ДАМАХ» **2**

«ЗВЯЗДОЎЦЫ» ЗНОЎ СЯРОД ЛЕПШЫХ! **10**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

5 ВЕРАСНЯ 2018 г. СЕРАДА № 170 (28786)

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей КІЛІН, намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:

«Правядзенне 31-га міжнароднага кангрэса Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў у Мінску адкрые новыя магчымасці для ўдзелу Беларусі ў міжнародных праектах. Спадзяёмся, што ўдзел вялікай колькасці касманаўтаў, прадстаўнікоў еўрапейскіх касмічных агенцтваў і NASA ў кангрэсе дазволіць нам больш якасна ўключыцца ў міжнародную касмічную дзейнасць.

У нас ёсць усе падставы для гэтага ў выглядзе навуковых дасягненняў, якія актыўна выкарыстоўваюцца.

У беларускіх арганізацый, вядома ж, ёсць жаданне ўдзельнічаць у новых міжнародных касмічных праектах. Яны цяпер рэалізуюцца ўжо па многіх напрамках».

КАРАТКА

- **Нацыянальная экспазіцыя Беларусі з 5 да 9 верасня будзе прадстаўлена на XXXI Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы.**
- Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі лічыць недастатковымі меры па ўрэгуляванні пытання платы за інтэрнат.
- **БелАЗ рыхтуе да пастаўкі ў Чылі падземны самазвал МаАЗ-75290 грузападымальнасцю 25 тон.**
- Арына Сабаленка ў 1/8 фіналу Адкрытага чэмпіянату ЗША прайграла Наомі Асацы з Японіі — 3:6, 6:2, 4:6.



- **Быхаўскую райбальніцу аштрафавалі на Br50 тыс. за парушэнні ў арганізацыі харчавання пацыентаў, у тым ліку недаўкладання прадуктаў.**

ISSN 1990 - 763X

СЯМЕЙНЫ АБЯРЭГ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Маладыя мінчане Сяргей і Кацярына Касякі і іхні аднагадовы сынок Павел любяць вандраваць па святочных кірмашах і фестывалях, якія праходзяць не толькі ў сталіцы, але і ў іншых гарадах і вёсках. А яшчэ яны любяць адзяваць аднолькавыя майкі з арнаментам, як на гэтым здымку, падкрэсліваючы сваё беларускае паходжанне і павагу да сваёй радзімы. Мінулымі выхаднымі наш фотакарэспандэнт сустрэў Касякоў у мястэчку Ракаў Валожынскага раёна, дзе праводзіўся фестываль нацыянальных культур.

■ Жыллё

Цэны ўжо на максімуме? Ці не?

Асобныя спецыялісты сталічнага рынку арэнды прагназуюць другую і нават трэцюю хвалі студэнцкага ажыятажу

Сёлетняя вясна на другасным рынку прыватнай арэнды не была спрыяльным сезонам для кватэраздатчыкаў. Мінулая зіма ўвогуле была складаным перыядам для ўласнікаў свабоднага жылля, бо колькасць кліентаў у гэты час не павялічылася, заробкі ў патэнцыйных кватарантаў не падраслі, а вось тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі за гэты час пайшлі ўгору. Але потым настаў час «ікс» і ўсё памянялася. Кліенты пачалі актыўна цікавіцца кватэрамі ўжо ў канцы ліпеня. А ў сярэдзіне жніўня будучыя кватаранты і іх бацькі ішлі ў агенцтвы нерухомасці цэлымі натоўпамі. Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» расказала начальнік аддзела арэнды агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ.

ШУКАЦЬ МОЖНА І САМІМ

Перад тым як стаць паўнавартасным кватарантам, трэба спачатку вызначыцца, як будзеце праводзіць пошук арэнднага жылля (самастойна альбо пры дапамозе спецыялістаў). Але нават у выпадку індывідуальнага пошуку вам не перашкодзяць некалькі парад ад нашага эксперта. Вось яны.

СТАР. 4

■ Месца дзеяння

Працягваем знаёміць з цікавымі людзьмі, якія ствараюць карысныя для грамадства праекты і дапамагаюць іншым знайсці сябе ў жыцці. Першапачаткова стаўка рабілася менавіта на прадстаўнікоў глыбінкі, тых, хто выбірае вёску і натхняе насельніцтва сваім прыкладам. Сённяшняя гераіня — гараджанка, але яе праект нельга назваць лакальным. Ён дазваляе знайсці сабе занятак жыхару любой мясцовасці. І, што асабліва важна, дае шанц менавіта людзям з абмежаванымі магчымасцямі.

ЧАС МАГЧЫМАСЦЯЎ

Мы шмат гаворым пра інклюзію, пра тое, што няма розніцы паміж людзьмі здаровымі і асаблівымі, пра тое, што інваліды — паўнавартасныя грамадзяне нашай краіны. Яны, вядома, удзячныя нам за гэта, але ці шмат вы ведаеце прыкладаў, калі побач са здаровымі шчасліва працуюць тыя, чые магчымасці абмежаваныя? Цяпер такая тэрыторыя ёсць. Месца дзеяння — горад Магілёў, вуліца Першамайская, 20.

СТАР. 7

Так рэалізоўвалася наша ідэя.

ПРЫЯРЫТЭТЫ, ВЫНІКІ, ПЕРСПЕКТЫВЫ

Учора Аляксандр Лукашэнка правёў шэраг сустрэч па міжнародным кірунку, прычым іх тэматыка атрымалася вельмі шырокай — ад спорту і сяброўства да экспартных паказчыкаў.

Сустрэча першая.

Размова пра экспарт і графік Прэзідэнта

У пачатку сустрэчы з міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем беларускі лідар падкрэсліў: першае і асноўнае пытанне — гэта аналіз знешнеэканамічнай дзейнасці. «Калі закранаць нашу знешнюю палітыку, у нас тут больш-менш стабільная сітуацыя. Што датычыцца ўвогуле знешнепалітычных прыярытэтаў, яны вызначаны — падабаюцца яны камунебудзь ці не, шматвектарнасць знешняй палітыкі вынікае з нашага месца ў свеце, вызначанага Госпадам Богам, і ад гэтага нікуды не дзенешся», — дадаў ён.

Прэзідэнт нагадаў, што эканоміка — гэта прыярытэт № 1. «Калі чагосьці баяцца, то трэба баяцца і дрыжаць за эканоміку, каб яна развівалася як мае быць. Ну а экспарт — гэта аснова нашай эканомікі, у нас экспартаарыентаваная дзяржава, таму знешнеэканамічная дзейнасць наша з акцэнтам на экспарт».

Другое пытанне — кантакты Прэзідэнта на найвышэйшым узроўні на астатні адрэзак гэтага года, асноўныя мерапрыемствы ўнутры краіны і з выездам за яе межы. Па словах кіраўніка дзяржавы, была дамоўленасць аб тым, што гэты аспект павінен быць сістэматызаваны.

Уладзімір Макей адзначыў, што па знешнеэканамічнай дзейнасці ёсць пэўныя пазітыўныя нюансы. «За першае паўгоддзе гэтага года экспарт вырас амаль на 20 % (19,4 %). Ідзе рост на ўсіх рынках — у залежнасці ад рынку ад 4 % да амаль 30 %. Гэта станоўчыя моманты, — падсумаваў Уладзімір Макей. — Вельмі актыўна развіваецца знешнеэканамічная дзейнасць з Кітаем. У нас тут рост на 37 %, пайшла сельскагаспадарчая прадукцыя».

Па выніках працоўнай сустрэчы Уладзімір Макей пагутарыў з журналістамі і адзначыў, што ёсць шэраг зрухаў, захоўваецца пазітыўнае сальда знешняга гандлю. Разам з тым, дадаў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства, зразумела, што не трэба цешыць сябе. «На жаль, адбываецца зніжэнне на працягу года дынамікі росту экспарту, — падкрэсліў ён. — Доля высокатэхналагічных тавараў у агульным экспарце нашай прадукцыі застаецца невысокай — гэта 2,5 % у цэлым і менш за 1 % на рынках Еўрапейскага саюза».

Міністр замежных спраў таксама дадаў, што не ўдалося дасягнуць дыверсіфікацыі ў маштабе траціна — траціна — траціна на рынках ЕАЭС, ЕС і краін Далёкай дугі. Пры гэтым павысіўся ўзровень экспарту ў краіны Еўрапейскага саюза і Далёкай дугі, знізіўся — у ЕАЭС.

Што датычыцца замежных устаноў Беларусі, то пераважная большасць з іх выконвае даведзеныя заданні па экспарце — гэта 45 устаноў, па 12 краінах дапушчана адставанне, таму Прэзідэнту было даложана аб тых мерах, якія плануецца прыняць. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу: рост экспарту па выніках года ва ўсіх краінах, з якімі супрацоўнічае Беларусь, а гэта 171 дзяржава.

Акрамя таго, беларускаму лідару быў прадстаўлены графік кантактаў на высокім узроўні як унутры краіны, так і за яе межамі. Узгоднены некаторыя канкрэтныя даты візітаў. «Да канца года плануецца вельмі актыўны графік у кіраўніка дзяржавы. Да нас будзе прыязджаць шэраг дзеячаў, мы плануем правесці некалькі важных мерапрыемстваў — гэта канферэнцыя АБСЕ па барацьбе з тэрарызмам у кіберпрасторы і сустрэча асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы», — расказаў Уладзімір Макей.

Паводле яго слоў, плануецца ўдзел Прэзідэнта ў гэтых мерапрыемствах, таму былі даложаны канкрэтныя прапановы з фарматам яго ўдзелу.

Што датычыцца геаграфіі замежных паездак беларускага лідара, плануецца шэраг паездак і па лініі розных інтэграцыйных структур — і ЕАЭС, і СНД, і АДКБ. Ёсць шэраг двухбаковых візітаў, найбліжэйшы — ва Узбекістан, па астатніх праводзяцца дадатковыя ўзгадненні.

На пытанне аб тым, ці абмяркоўвалася з Прэзідэнтам тэма гандлёвых супярэчнасцяў з Расіяй і роля МЗС у іх урэгуляванні, Уладзімір Макей нагадаў, што на найбліжэйшы час запланаваны кантакты кіраўнікоў дзяржаў з удзелам прадстаўнікоў двух урадаў. «Я думаю, трэба пачакаць вынікаў гэтых сустрэч. Перакананы, што з улікам таго, што абедзве дзяржавы імкнуцца канструктыўна падыходзіць да наяўных рознагалоссяў і праблем, нам удасца вырашыць тыя некаторыя рознагалоссі, якія існуюць на дадзены момант», — дадаў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства.

Сустрэча другая.

Пра блізкіх сяброў

У пачатку размовы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Ле Анем, які завяршае сваю дыпламатычную місію ў нашай краіне, Прэзідэнт заявіў: нягледзячы на тое што падобныя сустрэчы носяць пратакольны характар, яны важныя з пункту гледжання тых прыярытэтаў, якія Беларусь сёння выбудоўвае. «Для нас В'етнам — адзін з сур'ёзных знешнепалітычных прыярытэтаў, я нават скажу адкрыта — вы нам людзі не чужыя. Вы родныя для нас людзі, паколькі ў нашай гісторыі было тое, што бывае толькі з блізкімі людзьмі, — адзначыў беларускі лідар. — Мы разам змагаліся з вамі за суверэнітэт і незалежнасць В'етнама, і ў тым росквіце, які намеціўся ў В'етнаме, у тых поспехах, якія вы сёння маеце, мабыць, ёсць пэўная заслуга савецкага чалавека».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, цяперашнія адносіны дзвюх дзяржаў заснаваныя менавіта на падмурку і ідэалогіі таго перыяду, а таксама ўсіх тых кантактах ужо суверэннай незалежнай Беларусі і В'етнама. «Хачу вас запэўніць, перадайце гэта кіраўніцтву В'етнама, што бліжэйшых сяброў у свеце вы не знойдзеце», — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў: у Беларусі вельмі цэняць тое, што В'етнам і яго кіраўніцтва ставяцца да нашай краіны адпаведным чынам. «Вы заўсёды будзеце бачыць у нас не проста надзейных партнёраў — гэта не абмяркоўваецца, — блізкіх людзей, якія гатовы прыйсці вам на дапамогу ў любую хвіліну для таго, каб народ В'етнама, шматпакутны народ, жыў і квітнеў», — падкрэсліў беларускі лідар.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, нашы палітычныя адносіны, дыпламатыя значна апярэджваюць гандлёва-эканамічныя адносіны — такі аспект неабходна падцягваць і актывізаваць, Беларусь да гэтага гатовая. Вельмі важна і тое, што ўсё, што вырабляецца ў Беларусі, запатрабавана ў В'етнаме, у сваю чаргу і В'етнам вырабляе вельмі шмат тавараў, якія закупляе наша краіна на знешніх рынках.

Прэзідэнт падзякаваў Ле Аню за ўсё добрае, што ён зрабіў для збліжэння дзвюх дзяржаў і двух народаў. Па словах кіраўніка дзяржавы, вельмі хацелася б, каб новы пасол В'етнама ў Беларусі працягнуў тую палітыку, якую ажыццяўляў яго папярэднік.

Па выніках сустрэчы пасол пагутарыў з журналістамі. Ле Ань адзначыў, што Беларусь і В'етнам могуць узаемна дапаўняць адно аднаго ў розных сферах — у сельскай гаспадарцы, вытворчасці мясных, малочных прадуктаў, будаўніцтве, адукацыі, турызме і ваеннай галіне, каб дасягнуць мэты ў 500 мільёнаў долараў тавараабароту. Ён перакананы: калі кампетэнтныя органы дзвюх дзяржаў будуць працаваць больш актыўна, то бакі змогуць дасягнуць агульнай мэты.

Сустрэча трэцяя.

Пра падрыхтоўку да Еўрапейскіх гульняў

Як заявіў прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Янэз Качыянчыч па выніках сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам, кіраўнік беларускай дзяржавы не па чутках ведае аб спорце і выдатна ў ім разбіраецца. «Мая мэта заключалася ў тым, каб расказаць яму пра працэс падрыхтоўкі да Еўрапейскіх гульняў, якія адбудуцца менш чым праз 10 месяцаў. На мой погляд, падрыхтоўка арганізавана вельмі добра, сітуацыя ў цэлым вельмі радасная. Мы лічым, што Беларусь зможа правесці выдатныя гульні», — падкрэсліў прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў.

«Я таксама хацеў бы скарыстацца магчымасцю і падзякаваць ураду Рэспублікі Беларусь і яе лідарам за ўвядзенне бязвізавага рэжыму для гасцей дадзенага мерапрыемства, у прынцыпе для ўсіх — не толькі спартсменаў і гледачоў, а для ўсіх, хто хацеў бы прыехаць сюды і адкрыць для сябе Рэспубліку Беларусь. Спадзяюся, што вы, беларусы, зможаце скарыстацца гэтай выдатнай магчымасцю для таго, каб паказаць усяму свету, што ж такое сучасная і квітнеючая Беларусь», — сказаў Янэз Качыянчыч.

Падчас самой сустрэчы беларускі лідар адзначыў, што ў нашай краіне нямала зрабілі для паспяховага правядзення Еўрапейскіх гульняў, аднак нейкія недапрацоўкі, напэўна, прысутнічаюць — іх і папрасіў агучыць кіраўнік дзяржавы.

Янэз Качыянчыч расказаў журналістам, што ў найбліжэйшыя 10 месяцаў арганізацыйнаму камітэту трэба ўрэгуляваць невялікія тэхнічныя пытанні, тады як усе астатнія ўжо былі вырашаны.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

КАЛІ ХАТА НІКОМУ НЕ ТРЭБА...

Падпісаны ўказ, накіраваны на змяншэнне колькасці безгаспадарных і аварыйных будынкаў

У беларускіх вёсках больш за 30 тысяч дамоў прызнаныя старымі і звыш 10 тысяч — пустуючымі. Ці з'явяцца на гэтых участках гаспадары? Вырашэнню гэтага пытання будзе спрыяць новы ўказ «Аб пустуючых і старых дамах», які падпісаў учора Прэзідэнт. Больш падрабязна пра наваўвядзенні карэспандэнту БелТА расказала намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела прававога забеспячэння зямельных адносін, геадэзіі і картаграфіі юрыдычнага ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Антаніна ТОРБІНА.

Прамы продаж

Новы ўказ распаўсюджвае сваё дзеянне на ўсю тэрыторыю Беларусі, а не толькі на сельскую мясцовасць, як гэта прадугледжваў Указ № 100, які страціў сілу. Пры гэтым прапануюцца розныя варыянты ўключэння ў абарот пустых і старых дамоў, прызнаных камунальнай уласнасцю. З'явілася магчымасць іх прамога продажу. Адпаведныя прапановы па асобных аб'ектах будуць публікавацца на сайтах мясцовых выканкамаў. Калі на працягу 30 дзён заяву на куплю падасць толькі адзін чалавек, з ім будзе заключаны дагавор купліпродажу. Правядзенне аўкцыёну прадугледжана пры паступленні некалькіх заяў. Пры гэтым магчымасць прамога продажу ёсць на ўсёй тэрыторыі краіны, за выключэннем абласных цэнтраў і Мінска. Аблвыканкамы будуць мець права вызначаць з улікам інтарэсаў дзяржавы і мясцовых умоў іншыя населеныя пункты, на тэрыторыі якіх жылыя дамы будуць адчужацца толькі па выніках аўкцыёнаў.

«Магчымасць арганізацыі прамога продажу даецца з улікам попыту на нерухомасць і з мэтай зніжэння выдаткаў, бо на арганізацыю аўкцыёну патрабуюцца пэўныя грашовыя сродкі, якія пакрывае пераможца аўкцыёну», — адзначыла Антаніна Торбіна.

Зямельны ўчастак у абмен на знос

Упершыню ў грамадзян з'явілася магчымасць атрымаць зямельны ўчастак, не выкупляючы пустуючы або стары дом, на якім ён размешчаны. Але гэта пры ўмове самастойнага зносу такога дома альбо фінансавання падобных работ. Участак можна атрымаць без правядзення аўкцыёну на ўсёй тэрыторыі краіны, за выключэннем абласных цэнтраў. У такіх гарадах участкі могуць быць атрыманыя без аўкцыёну толькі грамадзянамі, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, і ў Мінску — толькі шматдзетнымі сем'ямі, якія стаяць на такім уліку.

У якім выпадку дом прызнаецца пустуючым або старым

Для выяўлення такіх дамоў спецыяльныя камісіі пры мясцовых выканкамах будуць двойчы ў год аглядаць нерухомасць на адпаведных тэрыторыях. Указам пашыраны склад гэтых камісій і дэталёва рэгламентаваны парадак іх работы.

Раней былі ўстаноўлены больш жорсткія ўмовы для прызнання жылых дамоў пустуючымі: неабходнасць пражывання ў іх уладальнікаў не менш за месяц на працягу кожнага года на працягу трох гадоў.

«Цяпер не будуць прызнавацца пустуючымі дамы, у якіх асобы, якія маюць права валодання і карыстання імі, пражывалі на працягу апошніх трох гадоў хоць бы адзін дзень. Пустыя дамы будуць вызначаць камісіі пры візуальным агляндзе. Калі ўстановяць відавочную адсутнасць жыхароў на працягу доўгага часу, будзе правярацца наяўнасць аплаты камунальных плацяжоў, расходу электраэнергіі, — растлумачыла Антаніна Торбіна. — У складзе камісій будуць і прадстаўнікі органаў унутраных спраў, якія апытаюць суседзяў, ці прыязджалі ў дом уласнікі або іншыя асобы, якія маюць права валодання і карыстання ім. Матэрыялы апытання, фатаграфіі будуць прыкладацца да заключэння камісіі. На падставе праверкі ўсіх абставін мясцовыя выканкамы будуць прымаць рашэнне аб уключэнні дома ў рэестр пустуючых дамоў».

Паведамленне пра намер выкарыстоўваць жылы дом для пражывання зараз можна падаваць у мясцовы выканкам не толькі асабіста, але і звычайным лістом, па электроннай пошце, факсе — любым даступным спосабам. Пры гэтым такое паведамленне можа падаць не толькі ўласнік, але і іншыя асобы, якія маюць права валодання і карыстання жылым домам, пры прадстаўленні пацвярджальных дакументаў. Падаўшы паведамленне, уладальнік дома абавязваецца ўтрымліваць зямельны ўчастак у належным стане.

Да старых папярэдні ўказ адносіў усе дамы, прызнаныя непрыдатнымі для пражывання, у якіх грамадзяне, што маюць права карыстання імі, не пражывалі на працягу года і не прымалі мер да іх аднаўлення. Згодна з дзейным заканадаўствам, камісіі будуць працаваць толькі з аварыйнымі і блізкімі да абвалу дамамі, даведзенымі да такога стану безгаспадарчымі дзеяннямі ўласніка.

«Стан дома будзе ацэньвацца на падставе візуальнага агляду. У склад камісіі ўвойдуць прадстаўнікі арганізацый, здольныя вызначыць адпаведнасць дома крытэрыям, якія дазваляюць аднесці яго да аварыйных або, да такіх, што знаходзяцца пад пагрозай абвалу. Мясцовы выканкам будзе падаваць заяву ў суд аб выкупе такога дома або продажы з публічных таргоў, калі пасля накіравання паведамленняў уласнік не прыступіў да яго аднаўлення, не звярнуўся па атрыманне дазволу на рэканструкцыю і не згодны знесці яго», — расказала Антаніна Торбіна.

Мінімальныя тэрміны аднаўлення або зносу дамоў падаўжаюцца да года. Пры гэтым калі ва ўласніка былі ўважлівыя прычыны, якія перашкаджалі аднаўленню дома, то пра іх можна паведаміць выканкаму, і гэты тэрмін можа быць прадоўжаны.

Максімальная абарона інтарэсаў уласнікаў

У новым указе прапісаны механізм магчымага вяртання ўласніку пустуючага або старога жылога дома, ужо перададзенага ў камунальную ўласнасць. Калі ўласнік не падаў паведамленне ў выканкам і ў яго былі на гэта ўважлівыя прычыны, якія невядомыя мясцоваму выканкаму, то гэты дом павінен быць яму вернуты (рашэнне прымае суд). Ва ўказе таксама прадугледжана магчымасць выплаты за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў кампенсацыі, калі дом знеслі, альбо выплаты грошай, выручаных ад продажу дома, калі дом быў адчужаны.

Новы дакумент захаваў базавыя падыходы ранейшага ўказа, якія паказалі сваю эфектыўнасць. Разам з тым ён пашырае магчымасці для ўключэння старых і пустуючых дамоў у абарот, пакідаючы ўласнікам вялікія магчымасці для захавання маёмасці.

Узбекскія пісьменнікі — госці Міністэрства інфармацыі

У апошні час шырокі прасцяг атрымліваюць беларуска-ўзбекскія медыйныя, літаратурныя, выдавецкія сувязі.

Адзін з прыкладаў — гасцяванне ў Беларусі старшыні Саюза пісьменнікаў Узбекістана народнага паэта Узбекістана Сіражыддзіна Саідава, а таксама кіраўніка фонду «Іжод» пры Саюзе пісьменнікаў Узбекістана Шэрзада Ізроева. Днямі сустрэчу з імі правёў міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч. Пасля сустрэчы ўдалося пагутарыць з кіраўніком пісьменніцкай арганізацыі.

— Мяне ўразіла Беларусь, мяне ўразілі беларусы, — сказаў спадар Сіражыддзін Саідаў. — Я ўпершыню гасцюю ў вашай краіне. Але паверце, дзякуючы вам, у мяне атрымалася канструктыўнае гасцяванне. У хуткім часе ў Ташкент з афіцыйным візітам наведаецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Мы вельмі рады гэтаму. І спадзяёмся на новае развіццё беларуска-ўзбекскіх адносін. У самых розных галінах жыццядзейнасці. Да візіту кіраўніка вашай краіны прымеркавана ўрачыстае адкрыццё бюста народнага песняра Беларусі Якуба Коласа ў Ташкенце. Перад ад'ездам у Беларусь мне пазванілі з друкарні і сказалі, што днямі будзе гатовы сігнал ды і ўвесь тыраж кнігі паэзіі Якуба Коласа на ўзбекскай мове. У нас ізноў з'явілася вуліца з імем Коласа, які ў час Вялікай Айчыннай жыў у сталіцы Узбекістана. Апошнімі днямі — у жніўні — узбекскія газеты надрукавалі некалькі матэрыялаў пра літаратурныя сувязі нашых краін. Ведаю, што ў вас выйшаў адмысловы «ўзбекскі выпуск» часопіса «Беларусь» на трох мовах: рускай, беларускай, кітайскай. Мы распрацавалі пры Саюзе пісьменнікаў Узбекістана праграму па прадстаўленні іншых нацыянальных літаратур на ўзбекскай мове. І за Беларуссю, беларускай літаратурай — несумненныя прыярытэты. У блізкай перспектыве мы збіраемся выдаць па-ўзбекску анталогію сучаснай беларускай паэзіі. Ёсць дамоўленасць пра выданне анталогіі сучаснай узбекскай паэзіі і ў Мінску — у перакладзе на беларускую мову. Ведаю, што на пачатку 1990-х выходзіла ў Мінску кніга лірыкі Алішэра Наваі. Але гэта такі паэт, што для яго прадстаўлення мала і дзясяткаў кніг. Так што чакаем, што сённяшняе пакаленне беларускіх перакладчыкаў возьмецца за перастварэнне паэзіі Алішэра Наваі на беларускую мову.

— Спадар Сіражыддзін, вось раней традыцыяй былі Дні нацыянальных літаратур...

— І я памятаю пра іх. Такія дні, дэкады дазвалялі пашыраць знаёмствы. Мяркую, што ў нас ёсць усе падставы правесці Дні беларускай літаратуры ва Узбекістане. Чаму б не арганізаваць і беларуска-ўзбекскі пісьменніцкі форум?! Гэта спрыяла б шырэйшай увазе да нашых нацыянальных культур і літаратур.

Застаецца дадаць, што спасцігнуць чужы свет, чужую культуру можна найперш праз слова і кнігу. Ідучы па гэтым шляху, пісьменнікі нашых краін — Узбекістана і Беларусі — шмат што здольны зрабіць.

Мікола БЕРЛЕЖ.

НАБЕГАЛІ НА 165 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ

Каб дапамагчы дзецям, беларусы прабеглі больш за 30 тысяч кіламетраў

У дабрачынным марафоне «Бягучыя гарады» ўзялі ўдзел больш за 5 тысяч беларусаў, якія прабеглі 30 тысяч кіламетраў, сабраўшы тым самым рэкордную суму — 165 тысяч рублёў. Сродкі пералічаны шасці дзіцячым рэабілітацыйным цэнтрам.

Рэспубліканская дабрачынная акцыя праходзіла ў межах праекта #velcombegom з 23 ліпеня па 2 верасня пры падтрымцы Міністэрства аховы здароўя і ахапіла ўсе вобласці. Дыстанцыі, якія пераадолелі ўдзельнікі, пайшлі ў залік пэўнаму рэгіёну. Кампанія velcom, арганізатар акцыі, падлічыла кіламетры, перавяла іх у грошы і пералічыла сродкі рэабілітацыйным цэнтрам. У выніку пераможцай стала Гродзенская вобласць — яе ўдзельнікі сумарна пераадолелі больш за 7 тысяч кіламетраў. На другім месцы — Гомельская вобласць з вынікам 5960 кіламетраў, трэцяе месца ў Брэсцкай вобласці — 5040. Астатнія месцы раздзялілі паміж сабой Магілёўскі рэгіён — 4927 кіламетраў, Віцебскі — 4823 кіламетры і Мінскі — 4157 кіламетраў.

Удзельнікі акцыі ставілі і асабістыя рэкорды. Самы доўгі забег на рахунку Пятра Рагойшы з Брэсцкай вобласці: за 12 гадзін ён пераадолеў 108 кіламетраў. Жыхарка Бабруйска Вольга Няжэльская за 12 гадзін прабегла 89,3 кіламетра. А самы масавы забег адбыўся ў Гомелі — 25 ліпеня на старт у абласным цэнтры выйшлі каля тысячы ўдзельнікаў. Падтрымалі акцыю і знакамітыя спартсмены. Біятланістка Надзея Скардзіна, напрыклад, падарыла свае кіламетры сталічнаму рэгіёну. Яму ж дадала 134 кіламетры і Дырэкцыя Еўрапейскіх гульняў.

Такім чынам, 40 тысяч рублёў атрымаў Гродзенскі абласны цэнтр медыцынскай рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў і хворых дзяцей псіханеўралагічнага профілю. Гомельскаму абласному дзіцячаму цэнтру медыцынскай рэабілітацыі «Верасок» пералічана 35 тысяч рублёў, а 30 тысяч рублёў накіравана Брэсцкаму абласному цэнтру «Тамашоўка». Магілёўскі дзіцячы цэнтр медыцынскай рэабілітацыі «Космас» атрымаў 25 тысяч рублёў, 20 тысяч рублёў — абласны дзіцячы рэабілітацыйны аздараўленчы цэнтр «Ветразь» (Віцебская вобласць), 15 тысяч рублёў — дзіцячы рэабілітацыйны цэнтр «Пухавічы» (Мінская вобласць).

— Як паказала наша акцыя, у Беларусі шмат нераўнадушных людзей. Дабрачынны праект праходзіць чатыры гады, і кожны раз нашу ініцыятыву падтрымліваюць тысячы беларусаў, — адзначыў **першы намеснік генеральнага дырэктара кампаніі velcom Мікалай ЮШКЕВІЧ.** Арганізатары паабяцалі, што ў праекта абавязкова будзе пяты сезон, які стане не менш запамінальным і карысным, чым папярэднія.

Алена КРАВЕЦ.

ДА ПАРЫ ЗБАН ВАДУ НОСІЦЬ...

У Гомелі завершана справа аб хабары ў 70 тысяч долараў

Як паведаміла афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя Крываногава, перад судом па справе 2008 года паўстане апошні абвінавачваны, які знаходзіўся ў міжнародным вышуку.

Па даных следства, антыкрызісны кіраўнік збанкручанага ТАА «Белаграпрад» уступіў у злачынную змову з заснавальнікам ТДА «Цэнтр нерухомасці» і яшчэ адным жыхаром горада Гомеля для таго, каб за хабар аказаць садзейнічанне дырэктару ТАА «Аўтаінвесткапітал» у набыцці ў абласным цэнтры будынка крамы ТАА «Белаграпрад».

Два зламыснікі павінны былі атрымаць ад дырэктара ТАА «Аўтаінвесткапітал» у якасці хабару для антыкрызіснага кіраўніка грашовыя сродкі ў суме 70 тысяч долараў. Аднак саўдзельнікі кіраўніка ў мэтах асабістага ўзбагачэння шляхам падману завысілі суму хабару на 30 тысяч долараў, пераканаўшы дырэктара перадаць увогуле 100 тысяч долараў.

Згодна са злачынным планам, антыкрызісны кіраўнік забяспечыў на аўкцыёне, праведзеным з парушэннем устаноўленага парадку, набыццё дырэктарам ТАА «Аўтаінвесткапітал» аб'екта нерухомасці, які цікавіў яго, па выгаднай цане. Перададзеныя дырэктарам у якасці хабару грошы ўдзельнікі злачынства падзялілі паміж сабой, пры гэтым кіраўнік атрымаў толькі 10 тысяч долараў.

Заснавальнік ТДА «Цэнтр нерухомасці», антыкрызісны кіраўнік і хабарадавальнік — дырэктар ТАА «Аўтаінвесткапітал» былі прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці яшчэ ў 2009 годзе. Чацвёртаму фігуранту ўдалося збегчы.

Па інфармацыі аператыўнікаў, «уцякач» меў крымінальныя сувязі як у Беларусі, так і за яе межамі. Таксама ён мог мець дачыненне не менш чым да дзвюх злачынных груп, якія дзейнічалі на тэрыторыі Гомельскай вобласці ў 2000-х гадах.

Абвінавачваны хаваўся ў Прыморскім краі Расійскай Федэрацыі, дзе займаўся прадпрымальніцкай дзейнасцю. Мужчына быў затрыманы праваахоўнымі органамі суседняй дзяржавы і этапіраваны ў Беларусь.

Следчае ўпраўленне УСК па Гомельскай вобласці кваліфікавала дзеянні абвінавачванага па ч. 6 арт. 16, ч. 3 арт. 430 (дапамога ў атрыманні хабару групай асоб па папярэдняй змове ў асабліва буйным памеры), ч. 4 арт. 209 (махлярства, учыненае групай асоб у асабліва буйным памеры) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Крымінальная справа перададзена ў пракуратуру для накіравання ў суд.

Сяргей КУЛАКОЎ.

УСЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА

У маладых навукоўцаў з'явіўся свой талісман

Новая скульптурная кампазіцыя «Пераемнасць беларускай навукі» з'явілася ў Мінску перад будынкам Прэзідыума НАН Беларусі: вопытны акадэмік запрашае ў Акадэмію навук маладога калегу. Яе адкрыццё адбылося ў рамках урачыстасцяў, прысвечаных пачатку новага навучальнага года ў Інстытуце падрыхтоўкі навуковых кадраў Акадэміі навук.

«Мы спецыяльна прымеркавалі гэту падзею да Дня ведаў, бо хацелі адкрыць мастацкую кампазіцыю менавіта з вашым удзелам, — падкрэсліў, звяртаючыся да новых магістрантаў, **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Мы лічым, што ў захаванні пераемнасці і заключаецца вялікі сэнс навукі».

Уладзімір Гусакоў заклікаў магістрантаў актыўна ўключацца ў жыццё навуковых арганізацый: «Моладзі сёння адводзіцца асаблівая роля. Работа даследчыкаў-пачаткоўцаў — гэта не толькі ўдзел у правядзенні прыярытэтных навуковых распрацовак, але і ўдасканаленне асобасных кампетэнцый, якія дазволяць маладому навукоўцу актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні найбольш актуальных праблем навукі і грамадства».

Аўтары манументальна-дэкаратыўнай кампазіцыі — скульптары Алена Хараберуш, Леанард Пакульніцкі і архітэктар Армен Сардараў. Скульптурная кампазіцыя не толькі выконвае дэкаратыўную функцыю, але і мае значны сэнс. Рэалізаваны ў бронзе праект, прысвечаны 90-годдзю НАН Беларусі, стане важнай мастацкай дамінантай у агульнай кампазіцыі зоны перад будынкам Прэзідыума НАН Беларусі, падкрэсліць асноўную задуму гістарычнага архітэктурнага збудавання і яго стыль.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Больш за 2/3 французаў не падтрымліваюць дзейнасць Макрона на пасадзе прэзідэнта

Папулярнасць прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона знаходзіцца на самым нізкім узроўні з моманту яго ўступлення на пасаду (май 2017 года), яна знізілася за месяц на дзесяць працэнтных пунктаў — да 31 %. Пра гэта сведчаць апублікаваныя ў аўторак вынікі апытання грамадскай думкі, праведзенага службай Ifop.

Папулярнасць Макрона апынулася нават ніжэй, чым у яго папярэдніка на прэзідэнцкай пасадзе Франсуа Аланда пасля такога ж перыяду — 1,4 года — знаходжання ва ўладзе (восенню 2013 года таго падтрымлівалі 32 % выбаршчыкаў).

Пры гэтым, па даных апытання, толькі 32 % французаў лічаць, што Макрон «праводзіць правільную эканамічную палітыку», у той час як супрацьлеглага меркавання прытрымліваюцца 68 % апытаных. У тым, што ў свайго дзейнасці прэзідэнт «блізкі да чаканняў французаў», упэўненыя толькі 22 % рэспандэнтаў.

У Венесуэле назвалі заявы аб гуманітарным крызісе апраўданнем для ўварвання ў краіну

Выканаўчы віцэ-прэзідэнт Венесуэлы Дэльсі Радрыгес ахарактарызавала заявы аб тым, што Венесуэла перажывае гуманітарны крызіс, як спробу апраўдаць магчымае знешняе ўварванне ў краіну. З такой заявай палітык выступіла, падкрэсліўшы, што сцвярджэнні аб сітуацыі ў краіне не адпавядаюць рэчаіснасці.

«Большасць тых, хто перасякае мяжу паміж Венесуэлай і Калумбіяй па мосце, з'яўляюцца калумбійцамі. 52 % прыходзяць па пакупкі, і толькі 33 % з'яўляюцца венесуэльцамі», — цытуе Радрыгес на сваім сайце тэлеканал Globovision. Па словах віцэ-прэзідэнта, розныя сілы спрабуюць паказаць сітуацыю вакол «нармальных міграцыйных патокаў» як гуманітарны крызіс. «Усё гэта заклікана апраўдаць уварванне на нацыянальную тэрыторыю», — адзначыла Радрыгес. Яна дадала, што ўлады Венесуэлы не дапусцяць такога развіцця падзей.

У апошнія гады Венесуэла перажывае востры сацыяльна-эканамічны крызіс, які суправаджаецца гіперінфляцыяй, дэвальвацыяй нацыянальнай валюты і дэфіцытам тавараў першай неабходнасці і лекаў. Цяжкая сітуацыя змушае многіх венесуэльцаў пакідаць радзіму. Паводле апошніх даных ААН, з Баліварыянскай Рэспублікі з'ехалі каля 2,3 млн чалавек, у асноўным у Калумбію, Эквадор, Перу і Бразілію.

«Страх»: у ЗША выйдзе новая кніга пра Дональда Трампа

75-гадовы Боб Вудвард, журналіст і рэдактар газеты The Washington Post, які разам з Карлам Бернштэйнам стаў знакаміты дзякуючы асвятленню Уотэргейцкага скандалу, публікуе кнігу пра Дональда Трампа. Яна выйдзе 11 верасня, і да гэтага часу ў прэсу не прасачылася ніводнага радка з гэтай загадкавай кнігі.

Усё пачалося з інтэрв'ю, якое Вудвард браў у Трампа ў красавіку 2016 года, калі нью-ёркскі мільярдэр яшчэ быў звычайным кандыдатам на праймерыз ад Рэспубліканскай партыі. Журналіст, як заўсёды, старанна падрыхтаваў пытанні, адно з якіх датычылася самага балючага для Трампа моманту — адносін да дзейнага тады прэзідэнта Барака Абамы. «Ці згодныя вы са сцверджаннем Абамы пра тое, што сапраўдная ўлада азначае дасягненне мэты без выкарыстання гвалту?» — спытаў журналіст. Трамп, заікаючыся, адказаў: «Я думаю, што ў гэтым ёсць пэўная праўда. Сапраўдная ўлада — гэта павага». А потым, пасля паўзы, дадаў: «Сапраўдная ўлада — гэта... я нават не маю права вымавіць... гэта страх».

Кніга Боба Вудварда пра Трампа так і называецца — «Страх». Вядома, што яна апісвае жыццё прэзідэнта ў Белым доме, над якім з моманту інаўгурацыі навіс цень імпічменту. Чакаецца, што выхад кнігі створыць эфект узарванай бомбы, піша газета Le Figaro.

Цэны ўжо на максімуме? Ці не?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пры аглядзе кватэры трэба звярнуць увагу на стан мэблі і спраўнасць бытавой тэхнікі. Ядрэнна праверыць, як зачыняюцца, адчыняюцца дзверы, ці без праблем працуе газавая пліта, ці няма складанасцяў з электрычнасцю і з падачай вады (ці не працякаюць краны). Калі ўсё ў парадку з бытавой тэхнікай і гаспадар заяўляе, што мэбля яго дарагая, варта скласці падрабязны вопіс маёмасці. Гэта робіцца, каб не было прэтэнзій у далейшым з абодвух бакоў (калі вы купілі сабе дадатковае крэсла, як потым даказаць, што яно менавіта ваша?).

І ўсё ж найбольш (у разы) падаражэлі асобныя пакоі ў шматпакаёвых кватэрах. Калі вясной такое жыллё здавалася па 100—140 рублёў, то цяпер за яго просяць ад 200 да 240 рублёў.

Але галоўнае, на што трэба глядзець найбольш пільна, — дакументы на кватэру. Вы павінны дакладна пераканацца, што чалавек, які стаіць перад вамі, непасрэдна з'яўляецца ўласнікам жылля. І яшчэ адзін немалаважны факт — колькі чалавек прапісана ў кватэры. Бо калі ў кватэры зарэгістравана шмат людзей, або, яшчэ горш, — нікога, то кватаранту давядзецца плаціць немалыя грошы за камунальныя паслугі. Асабліва яны ўзрастуць у ацяпляльны сезон.

АРЭНДА — ПЛЮС 10—15 %

Якая сітуацыя на рынку зараз. Ажыятаж? Ён, па сутнасці, ужо завяршаецца. Большасць студэнтаў ужо знайшлі сабе жыллё, але ўсё ж такі засталіся яшчэ старшакурснікі, якія менавіта цяпер шукаюць сабе кватэры. Некаторыя толькі даведаліся, што пакой у інтэрнаце ім ужо не даюць. Адпаведна, колькасць студэнтаў на прыватным рынку арэнды Мінска павялічылася.

Павышаны попыт справакаваў павелічэнне цаны арэнды. Калі вясной можна было лёгка знайсці жыллё за 320—360 рублёў, то зараз менш чым за 400 рублёў адшукаць кватэру практычна немагчыма. Ды і за такую суму знайсці зараз штосьці вельмі праблематычна — засталіся адзінкі бюджэтных варыянтаў. Сярэдні кошт арэнды аднапакаёвых кватэр зараз дасягае 500 рублёў у месяц. Праўда, за такі немаленькі тарыф вам прапануюць кватэру, цалкам укамплектаваную бытавой тэхнікай (тэлевізар, халадзільнік і пральная машына) і досыць свежай мэбляй.

Слабенькія двухпакаёвыя кватэры каля кальцавой дарогі з мінімальнай камплектацыяй мэблі і тэхнікі здаваліся раней за 400 рублёў. Цяпер бюджэтныя двухпакаёўкі каштуюць мінімум 500 рублёў, а сярэдняя цана такіх кватэр дасягае 560 рублёў. Менавіта танныя аднапакаёвыя і двухпакаёвыя кватэры былі «вымытыя» з рынку арэнды ў сталіцы за апошні месяц у першую чаргу.

Дзесьці на 80 рублёў падаражэлі і бюджэтныя трохпакаёвыя кватэры. У чэрвені яны каштавалі 460, а зараз — 540—560 рублёў у месяц. Сярэдняя цана арэнды трохпакаёвай кватэры складае 600—640 рублёў.

І ўсё ж найбольш за ўсё (у разы) падаражэлі асобныя пакоі ў шматпакаёвых кватэрах. Калі вясной такое жыллё здавалася па 100—140 рублёў, то цяпер за яго просяць ад 200 да 240 рублёў.

БАЦЬКАМ ДАВЯРАЮЦЬ БОЛЬШ

У гэтым годзе пры засяленні ў кватэры першакурснікаў існавала нават свая спецыяльная «фішка». Гэта калі пошукам жылля цалкам займаюцца бацькі.

Дарослыя тэлефануюць у агенцтва, дамаўляюцца аб сустрэчы і нават падпісваюць дагавор. Яны, па сутнасці, выступаюць гарантам таго, што з кватэрай усё добра, ды і своечасова будзе ўнесена аплата. Дарослыя людзі з двух бакоў абменьваюцца тэлефонамі і разумеюць, што ў любым выпадку ўсе іх праблемы вырашаюцца менавіта імі. У дадзенай сітуацыі гаспадары кватэр больш ахвотна згаджаюцца і на зніжкі.

Што датычыцца кватарантаў з жывёламі. Гэта ўсё даволі індывідуальна. Калі здаецца кватэра з дарагім рамонтам, то гаспадары жылля будуць катэгарычна супраць. Але бываюць такія мініяцюрныя сабачкі (навучаныя паводзіць сябе добра), што ім дазволяць жыць усюды.

КАМПАНЬЁНСТВА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА

Адной з тэндэнцый на рынку арэнды стаў упэўнены попыт на ложка-месцы. Сітуацыя для ўладальнікаў свабодных квадратных метраў ускладняецца цяпер яшчэ і тым, што на прыватным рынку назіраецца актыўнае развіццё кампаньёнства зусім незнаёмых людзей і сем'яў. Калі раней кожная маладая сям'я ці пара жыла абавязкова ў асобнай кватэры, то сучасная моладзь усё часцей ставіцца да гэтага некрытычна.

У прасторнай трохпакаёвай кватэры могуць беспраблемна жыць адразу дзве ці нават тры бяздзетныя сям'і. Калі раней студэнты цікавіліся пакоямі, то сёння яны выбіраюць адну вялікую кватэру на ўсіх. Сучасная моладзь гатовая дзяліць жылое памяшканне з сябрамі — усё гэта дзеля эканоміі.

СТУДЭНЦКІ БУМ — ДА СЯРЭДЗІНЫ ВЕРАСНЯ

Цяпер у сталічным агенцтве нерухомасці колькасць заказаў ад патэнцыйных кватарантаў практычна адпавядае новым паступленням свабодных кватэр. Актыўная дзейнасць рынку, звязаная з жыллёвымі праблемамі студэнтаў, працягнецца максімум да 15—20 верасня, лічыць спадарыня Пачыцкая.

Цікава, а якое жыллё сёння заказвае ў агенцтва яго масавы кліент? Галоўным чынам яму неабходна аднапакаёвая кватэра з мэбляй і бытавой тэхнікай у добрым стане за прымальную стаўку арэнды.

Сярод новых павеваў у сферы арэнды — патрабаванні кватарантаў, каб у іх здымнай кватэры быў абавязкова нехта прапісаны (зарэгістраваны), а таксама каб з уласнікам кватэры быў заключаны афіцыйны дагавор у ЖЭСе.

Гэтыя патрабаванні цалкам зразумелыя, бо ў кватэры, дзе ніхто не зарэгістраваны, «жыроўка» за ацяпленне зімой можа павялічыцца да шалёных лічбаў. Заключэнне дагавора (дзе агучаны памер аплаты) у час сярэдніх цэннікаў на арэнду дадае кватаранту ўпэўненасці, што ўжо заўтра тарыф арэнды гаспадаром кватэры істотна не павялічыцца.

Сярэдні кошт арэнды аднапакаёвых кватэр зараз дасягае 500 рублёў у месяц.

І яшчэ. Праз месяц на рынку можа назірацца другая хваля студэнцкага ажыятажу. Частка маладых людзей не спраўляецца з поўнай свабодай у чужым горадзе. Ужо ў першыя (другія або трэція) выхадныя верасня яны шумна святкуюць да сярэдзіны ночы. Не ўсе суседзі з гэтым пагаджаюцца. Потым прыязджаюць міліцыя і гаспадары кватэры. З такімі кватарантамі ўласнікі жылля расстаюцца досыць хутка. Узнікненню другой хвалі спрыяе нежаданне асобных кватарантаў і (або) арэндадаўцаў пісьмова заключаць дагаворы. Але ў гэтым выпадку кватаранта могуць выгнаць на вуліцу ўжо праз месяц.

ПРАБЛЕМА «ШЭРЫХ» АГЕНТАЎ

Сёння на рынку прыватнай арэнды жылля існуе праблема, калі паслугі па пошуку варыянтаў кліенту прапануюць спецыялісты-адзіночкі, якія раней працавалі рыэлтарамі ў агенцтвах нерухомасці. У іх ёсць вопыт аналізу спецыялізаванай інфармацыі з розных крыніц. Часам яны завабліваюць кліентаў нізкімі цэнамі, якія на самай справе не адпавядаюць рэчаіснасці. Калі такі «шэры» агент не паказвае вам спецыяльную картку работніка вядомага вам агенцтва, то спажывец не мае ніякіх гарантый таго, што атрымае якасную паслугу. Нагадаю, што ў легальным арэндным бізнесе кліенту абавязкова выдаюцца дагавор і чэк. Без гэтых дакументаў чалавек увогуле не абаронены ад махлярства.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Фінансавы выдатнік

Грашовыя рэбусы ад банка

У першую сераду верасня пяты раз стартуе рэспубліканская акцыя Белаграпрамбанка па фінансавай адукаванасці «Твае першыя фінансы».

У гэтым годзе ўрачыстае адкрыццё маштабнага восеньскага марафону адбудзецца ў сталіцы ў сярэдняй школе № 4 (вул. Чырвонаармейская, 11).

Усяго ж каля 103 тысяч беларускіх пяцікласнікаў па ўсёй краіне стануць удзельнікамі праекта Белаграпрамбанка. У рамках урокаў фінансавай адукаванасці хлопчыкаў і дзяўчатак чакаюць віктарыны, гульні і конкурсы. Не абыдуцца такія сустрэчы і без сюрпрызаў. А кульмінацыяй гэтых своеасаблівых урокаў стане ўручэнне маляўнічых зборнікаў тэматычных апавяданняў на беларускай мове «Твае першыя фінансы».

Штогод брашура ўдасканальваецца і дапаўняецца. У гэтым годзе да фінансавых казак, гісторый аб узнікненні грошай, укладах, крэдытах, парад па правільным выкарыстанні зберажэнняў, расказаў пра важнасць і неабходнасці банкаў дадасца цэлы раздзел займальных галаваломак і рэбусаў з яркімі ілюстрацыямі, табліцамі і малюнкамі. З іх дапамогай дзеці змогуць праверыць атрыманыя веды ў сферы фінансаў.

Сяргей КУРКАЧ

■ IT-краіна

Забраніраваць гасцініцу — па студэнцкім білеце

Такая магчымасць з'явіцца сёлета ў першакурснікаў БДУ

Унікальны электронны студэнцкі білет, сумешчаны з банкаўскай карткай ААТ «Белінвестбанк», атрымаюць каля пяці тысяч першакурснікаў і магістрантаў БДУ бюджэтнай і платнай формаў навучання. Яго перавагамі з'яўляюцца шматфункцыянальнасць, тэхналагічнасць, кампактнасць і высокі ўзровень абароны.

Новы студэнцкі білет сумяшчае на адным бескантактавым мікрачыпе сродак радыёчастотнай ідэнтыфікацыі і плацежную праграму. Першы забяспечвае пропуск на тэрыторыю і ў карпусы ўніверсітэта, а таксама абслугоўванне ў Фундаментальнай бібліятэцы БДУ, другі — магчымасць ажыццяўляць розныя разлікі. У прыватнасці, набываць тавары ў інтэрнэце на беларускіх і замежных сайтах, разлічвацца за праезд у метро і г. д. Трымальнікам студэнцкага білета бясплатна даступныя мабільны і інтэрнэт-банкінг Белінвестбанка, якія дазваляюць хутка аплачваць вучобу, інтэрнат, мабільную сувязь без наведвання аддзялення банка. Новы студэнцкі білет стане памочнікам і на адпачынку, дазволіўшы здзяйсняць разлікі за мяжой, браніраваць і аплачваць пражыванне, авія- і чыгуначныя квіткі.

Па фармаце студэнцкі білет не адрозніваецца ад звычайнай плацежнай карткі. На адным яго баку змяшчаюцца звесткі пра студэнта (магістранта): фатаграфія, нумар білета і банкаўскай карткі. У верхнім правым куце размешчана сімволіка БДУ і Міністэрства адукацыі Беларусі, а ў левым — лагатып Белінвестбанка.

Трэба дадаць, што новы студэнцкі білет з'яўляецца навуковай распрацоўкай Цэнтра інфармацыйных тэхналогій БДУ, выкананай з прыцягненнем вядучых спецыялістаў у гэтай галіне. Яго стварэнне і ўкараненне разглядаюцца як частка праграмы шырокамаштабнай лічбавай трансфармацыі.

Нагадаем, што ў 2003 годзе Белдзяржуніверсітэт стаў першай ВНУ ў краіне, дзе былі ўведзеныя ў карыстанне электронныя студэнцкія білеты. У 2010 годзе яны былі ўкаранёныя ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі краіны.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Актуаліі

ПРЭСА ЗАСТАЕЦЦА Ў ТРЭНДЗЕ

НАКОЛЬКІ ЗАПАТРАБАВАНА ПАДПІСКА?

Хуткае распаўсюджванне сучасных тэхналогій імкліва змяніла рынак друкаваных СМІ. Зараз ужо не сустрэнеш чэргаў у газетныя кіёскі, ды і ў грамадскім транспарце не так шмат людзей едзе з разгорнутымі нумарамі свежых газет. Але разам з тым працягвае працаваць такі інструмент, як падпіска. Наколькі яна запатрабавана ў сучасным грамадстве? Аб гэтым расказвае намеснік начальніка ўпраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта» Вольга СІДАРЧУК.

— Як пачынаецца і як праходзіць падрыхтоўка да чарговай падпіснай кампаніі? Якія мерапрыемствы запланаваны і ажыццяўляюцца?

— Падпісная кампанія на першае паўгоддзе 2019-га пачнецца ўжо вельмі хутка. Зараз мы фарміруем падпісныя каталогі. Рэдакцыі друкаваных перыядычных выданняў ужо атрымалі ад нас лісты з усёй неабходнай інфармацыяй.

Мы хочам прыцягнуць увагу да падпіскі на друкаваныя СМІ. Для гэтага шмат робім. Так, у аддзяленнях паштовай сувязі, на сайце прадпрыемства, у сацыяльных сетках, у друкаваных СМІ, на радыё і тэлебачанні праводзіцца актыўная рэкламная кампанія. Юрыдычныя асобы атрымліваюць запрашэнні да афармлення падпіскі.

Але гэтым мы не абмяжоўваемся. Рэгулярна праводзяцца акцыі «Дзень чытача», «Дзень падпісчыка». Таксама на пастаяннай аснове праводзіцца дабрачынная акцыя «Падары часопіс дзіцяці», скіраваная на дзіцячыя дамы. У буйных аддзяленнях паштовай сувязі па ўсёй краіне ўстаноўлены «Дрэвы дабра». Што гэта такое? Кожны ахвотны можа афармiць з дапамогай такога дрэва падпіску на любое выданне на адрас дзяцей, якія выхоўваюцца ў дзіцячых дамах. Акцыя праводзіцца з 2014 года і займела за гэты час шырокую падтрымку — дзякуючы нашым людзям тысячы дзяцей атрымліваюць і чытаюць выданні, прызначаныя для іх. Акрамя таго, распачнуцца сумесныя акцыі разам з рэдакцыямі газет, дзе будзе прымацца падпіска па больш нізкіх коштах.

— Колькі на дадзены момант выданняў у падпісным каталогу «Белпошты»?

— Каталогі РУП «Белпошта» змяшчаюць больш за тысячу найменняў айчынных выданняў і больш за дзве з паловай тысячы найменняў замежных выданняў.

— Наколькі моцна новыя тэхналогіі выцясняюць друкаваныя СМІ?

— Нельга адмаўляць, што цяпер інтэрнэт стаў адной з галоўных пляцовак для развіцця многіх сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку і друкаваных. Сёння азнаёміцца з электроннай версіяй большасці выданняў можна бясплатна праз інтэрнэт у любы зручны час, што большасць з нас і робіць. Разам з тым патрэба ў друкаваных СМІ ў чытачоў застанецца, што мы бачым на прыкладзе, скажам, шэрагу замежных краін. Іншая рэч, што перафарматуюцца тыпы выданняў. Навіны сышлі ў інтэрнэт, а аналітыка, жанравая журналістыка па-ранейшаму выглядае больш прэзентабельна на паперы. Не кажучы ўжо пра часопісы.

— Існуе думка, што падпіска на друкаваныя выданні больш распаўсюджана па-за межамі буйных гарадоў. Калі ўзяць шэсць абласцей і Мінск, якая працэнтная доля распаўсюджання падпіскі?

— Удзельная вага падпіскі, прынятай у Мінску, складае каля 9 % ад агульнага падпіснога тыражу.

— Што больш выпісваюць беларусы — рэспубліканскія, абласныя, гарадскія, раённыя выданні? Якую частку ад аб'ёму падпіскі займаюць часопісы?

— Самыя запатрабаваныя выданні ў нашых беларускіх падпісчыкаў — рэспубліканскія газеты, на другім месцы часопісы. Цікава адзначыць, што ўдзельная вага падпіскі на часопісы складае каля чвэрці ад агульнага падпіснога тыражу. У рэгіёнах, натуральна, запатрабаваная мясцовая прэса.

— Як шмат у нас выпісваецца замежных выданняў? Якія краіны прадстаўлены?

— Падпісны тыраж замежных выданняў невялікі. Ад усёй прынятай нашым прадпрыемствам падпіскі ён складае ўсяго толькі 1,7 працэнта. Выданні з іншых краін атрымліваюць пераважна фізічныя асобы. Зараз праз нашы каталогі ў асноўным распаўсюджваюцца газеты і часопісы Расіі, Казахстана і Украіны.

— Як часта праводзяцца дні падпісчыка? Наколькі яны папулярныя?

— Дні падпісчыка праводзяцца рэгулярна ў аддзяленнях паштовай сувязі, на буйных прадпрыемствах, у гандлёвых цэнтрах, адміністрацыях гарадоў. Практычна ні адно грамадскае мерапрыемства з удзелам РУП «Белпошта» не праходзіць без арганізацыі падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі. Такі фармат правядзення дазваляе больш цесна пагутарыць з чытачамі, даведацца пра іх густы. А для рэдакцый, адпаведна, гэта найлепшая падказка па плане дзеяння.

— Якая самая дарагая пазіцыя ў падпісным каталогу?

— Самымі дарагімі падпіснымі выданнямі з'яўляюцца замежныя навуковыя выданні. У іх вузкая мэтавая аўдыторыя, спецыялізаваны кантэкст, што і вызначае высокі кошт ■

ДА ДНЯ ПІСЬМЕНСТВА

Урачыстая цырымонія памятнага гашэння спецыяльнага канверта да XXV Дня беларускага пісьменства адбылася ў Іванаве.

Мастацкі канверт аддрукаваны Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі тыражом у 20 тысяч экзэмпляраў. Ён упрыгожаны эмблемай свята і гербам Іванава, які ўяўляе сабой варажскі шчыт, на блакітным фоне якога намаляваны сярэбраны храм, размешчаны паміж рагамі залатой падковы. Арыгінальная марка намаляваная ў выглядзе некалькіх кніг, скруткаў, запаленай свечкі, гадзінніка і чарнільніцы з пяром. У левым ніжнім куце адлюстравана цэнтральная плошча Іванава з Пакроўскай царквой, Крыжаўзвіжанскім касцёлам і будынкам райвыканкама.

Цырымонія гашэння спецыяльным штэмпелем мастацкага маркіраванага канверта, якую правялі намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка, старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль Ліс і старшыня Іванаўскага райвыканкама Юрый Бісун, прайшла каля павільёна РУП «Белпошта» на цэнтральнай плошчы горада.

Акрамя таго, была пагашана марка «Герб Іванава». Яе тыраж складае 54 тысячы экзэмпляраў. Марка папоўніла серыю «Гербы гарадоў Беларусі».

СУСВЕТНЫ КАНГРЭС

Зараз у сталіцы Эфіопіі Адыс-Абебе праходзіць пазачарговы кангрэс Сусветнага паштовага саюза. Ён будзе доўжыцца да 7 верасня. На афрыканскі кантынент адправілася беларуская дэлегацыя на чале з намеснікам міністра сувязі і інфарматызацыі Наталляй Гардзеенкай. Усяго ж у Адыс-Абебе знаходзяцца дэлегаты з 192 краін свету.

Сусветнаму паштоваму саюзу — 144 гады. Але гэты пазачарговы кангрэс, які арганізаваў урад Эфіопіі разам з Сусветным паштовым саюзам, стаў усяго другім у гісторыі. На ім абмяркоўваюцца рэформа саюза і адаптацыя пошты да асаблівасцяў сучаснага свету. У тым ліку — беручы пад увагу змены, якія адбываюцца ў патрэбах кліентаў і ў паштовым асяроддзі ўвогуле. Свае прапановы ўнясе і наша дэлегацыя.

ЯШЧАРКІ НА МАРКАХ

Белпошта працягвае друкаваць маркі, прысвечаныя відам, якія сустракаюцца ў беларускай флоры і фаўне. На гэты раз на друкарскі станок трапілі выявы трох відаў яшчарак, якія можна сустрэць у нашай краіне. Гэта яшчарка порсткая, жывародная і вераценніца ломкая. Аўтар дызайну — Марына Віткоўская. Мастак — Аляксандр Міцянін.

Яшчарку порсткую бачылі ўсе. У яе светлы ніз жывата, а на спіне ёсць палосы. У выпадку небяспекі яшчарка тут жа адкідвае свой хвост. Вылучаецца вельмі рэзкімі рухамі. Жывародная яшчарка, у адрозненне ад порсткай, не адкладвае яйкі ў зямлю, а носіць іх у сабе. А вось вераценніцу ломкую, на жаль, вельмі часта блытаюць з атрутнай змяёй мядзянкай з-за моцнага падабенства і стараюцца знішчыць. Хоць сама яшчарка людзей не баіцца і добра прыручаецца. З-за гэтага яна ўжо трапіла ў Чырвоныя кнігі многіх расійскіх рэгіёнаў.

Маркі аддрукаваны тыражом па 75 тысяч экзэмпляраў кожная. Акрамя таго, яны выйшлі і ў малым лісце. Яго тыраж — 20 тысяч.

Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.

У ПАМЯЦЬ АБ ЕШЫВЕ

У 1815 годзе ў мястэчку Мір адкрылася ешыва — адна з самых вядомых яўрэйскіх вышэйшых навучальных рэлігійных устаноў. Ешыва працавала на Карэліччыне амаль 124 гады і толькі ў 1939-м змяніла прапіску на вільнюскую. Нягледзячы на ваеннае ліхалецце, будынак ешывы захаваўся і да нашых часоў. У ім размясцілася аддзяленне паштовай сувязі пасёлка. А ў жніўні адбылося яго ўрачыстае адкрыццё пасля рамонту.

Памяць аб тым, што тут калісьці знаходзілася ешыва, увекавечана ў мемарыяльнай дошцы. Яе ўрачыста адкрылі галоўны рабін саюза Рэлігійных яўрэйскіх абшчын Рэспублікі Беларусь Мардэхай Райхінштэйн і намеснік старшыні Карэліцкага раённага выканаўчага камітэта Руслан Абрамчык.

У паштовым аддзяленні працуе два аперацыйныя акны, якія выконваюць усе паштовыя паслугі. Таксама прымаюцца плацяжы за камунальныя паслугі, мабільныя тэлефоны, страхаванне. Усталяваны і плацежна-даведачны тэрмінал.

Да таго ж проста на месцы можна зняць наяўныя грошы і папоўніць рахункі пластыкавых картак чатырох банкаў. Сярод іх — Беларусбанк, Пріорбанк, МТБанк, Белаграпрамбанк. Камісія за гэтыя плацяжы брацца не будзе. Акрамя таго, непасрэдна на пошце можна будзе набыць розныя тавары паўсядзённага попыту, а таксама заказаць пакупкі праз спецыяльны інтэрнэт-магазін.

«Са «Звяздою» не замерзнеш!»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2018 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 10 кастрычніка 2018 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў 11.10.2018 года будуць разыграны 7 цеплавентылятараў Normann і суперпрыз — ЭЛЕКТРАКАМІН ELECTROLUX. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 21.10.2018 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.12.2018 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2018 года і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Са «Звяздою» не замерзнеш!» чытайце ў нумары газеты «Звязда» ад 4 верасня 2018 г.

Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.

Тэрмін правядзення гульні — з 05.09.2018 па 31.12.2018.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3366 ад 27.08.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2018 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

на IV квартал або II паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон _____
(абавязкова) **(індэкс)**

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению торгово-производственного республиканского унитарного предприятия «БЕЛФАРМАЦИЯ» (продавец) проводит открытый аукцион **по продаже права заключения договора аренды:**

	Лот № 1	Характеристика
Наименование объекта	Изолированное помещение наименование – офис № 2 (инв. № 500/D-707999482)	**Изолированное помещение (административное помещение)** общей площадью **82,9 кв. м.** Площадь находится в пятиэтажном здании 2009 года постройки. В здании имеется отопление, водопровод, канализация, вентиляция, телефон
Местонахождение объекта	г. Минск, ул. Крупской, д. 17, пом. 39	
Общая площадь, кв. м	82,9	
Срок договора аренды	3 года	
Начальная цена права заключения договора аренды, бел. руб.	333 руб. 88 коп.	
Сумма задатка, бел. руб.	33 руб. 39 коп.	
Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта, бел. руб.	1 602 руб.62 коп.	
Целевое использование имущества	Для осуществления любого вида деятельности, за исключением размещения аптеки	
Условия продажи объекта аукциона	Уборка прилегающей территории	

Базовая арендная величина с 01.04.2018 составляет 16,11 бел. руб. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства. Аукцион состоится **09.10.2018** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.10.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17, сайт в сети интернет: www.rlt.by**

Открытое акционерное общество «Стройдетали»
Месторасположение: Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская, д. 134

Общим собранием акционеров общества от 31.08.2018 г. принято решение о выплате дивидендов акционерам за 1-е полугодие 2018 г.

Размер начисленных дивидендов на 1 простую акцию составляет 1,34 руб.

Дата выплаты дивидендов с 03.09.2018 г. по 30.11.2018 г. путем перечисления на карт-счета, почтовым переводом и кассу предприятия.

УНП 600246748

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже автомобилей, принадлежащих РУП «Белгипроводхоз»

Лот № 1. Автомобиль ГАЗ-2705-410, гос. № АЕ7214-7. 2008 г. в. Инв. № 50401. **Начальная цена продажи с учетом НДС 20 % – 2 028,76 бел. руб. Сумма задатка – 202,88 бел. руб.**

Лот № 2. Автомобиль ГАЗ-2705-410, гос. № АЕ7212-7. 2008 г. в. Инв. № 50403. **Начальная цена продажи с учетом НДС 20 % – 2 028,76 бел. руб. Сумма задатка – 202,88 бел. руб.**

Адрес метонахождения лотов: г. Заславль, ул. Советская, 122. Шаг аукциона – 5 %

Условия аукциона: 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 5 (пяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.

2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи.

3. Продавец обязуется передать Победителю аукциона (Претенденту на покупку) Объект (Объекты) в течение 20 (двадцати) календарных дней после полной оплаты стоимости, приобретенного на аукционе Объекта (Объектов).

4. Самовывоз Объекта (Объектов) осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) с места хранения Объекта (Объектов).

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость услуги и стоимость затрат на приобретение товаров, работ, услуг у сторонних организаций (индивидуальных предпринимателей) на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

6. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 составляет 1 000,00 бел. руб.

Аукцион состоится 27.09.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества, принадлежащего РУП «Белгипроводхоз», проводимом 27 сентября 2018 г. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 25.09.2018 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов – Куприянчик Руслан Сергеевич, тел. 8 (029) 651-40-34. Первое извещение опубликовано в газете «Звязда» от 26.06.2018

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-59 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Несвижский райагросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **гаража для хранения сельхозмашин с инв. № 621/С-1027217 1560,1 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624250100001005100 площадью 0,6459 га по адресу: Минская область, Несвижский район, г. Несвиж, ул. Радзивилловская, 9. В состав капитального строения входят: гараж для хранения сельхозмашин, пристройка, асфальтное покрытие.** *Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт (0,0304 га), охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт (0,0083 га).*

Начальная цена с НДС (20 %) – **220 760,64** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 22 076,00 бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **08.10.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.10.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Кофеин» (УНП 690646615, Минская обл., Минский р-н, Остромицко-Городокский с/с, д. Остромицкий Городок, ул. Ленинская, д. 46), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

Дата и время проведения торгов: **9 октября 2018 года**. Начало – 10.00, окончание – 12.00. Заявки принимаются с 5 сентября 2018 года по 8 октября 2018 года.

Место проведения торгов: Минск, пр-т Победителей, 21, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «Кофеин» (УНП 690646615)** в лице управляющего Частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт».

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена, без учета НДС, руб.	Шаг торгов	Задаток
1	Капитальное строение (здание нежилое), инв. № 611/С-10530, площадь – 1670,20 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Зеленая, д. 22	128000,00	5 %	5 %
	Земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения, инв. № 620450100001002789, площадь – 0,3289 га, адрес: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Зеленая, д. 22	24000,00		
2	Грузовой автомобиль PEUGEOT EXPERT, рег. знак АН 7176-5	9700,00		
Местонахождение		Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Зеленая, 22		

Для участия в торгах необходимо:

в срок до **8 октября 2018 года** (за день до окончания) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY56MTBK30120001093300086460, в ЗАО «МТБанк», код MTBKBY22, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация»;

подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 08.10.2018 (за день до торгов) заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»;

в день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае если:

– заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;

– на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении повторного открытого аукциона ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ открытым акционерным обществом «Белорусский цементный завод»

Лот № 1. Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4727, расположенное по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Боровика, 44Б-1, начальная цена продажи – **12288** рублей, в т. ч. НДС – 2048 руб.

Лот № 2. Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4728, расположенное по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Боровика, 44Б-2, начальная цена продажи – **11808** рублей, в т. ч. НДС – 1956 руб.

Лот № 3. Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4729, расположенное по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Боровика, 44Б-3, начальная цена продажи – **11904** рубля, в т. ч. НДС – 1984 руб.

Лот № 4. Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4730, расположенное по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Боровика, 44Б-4, начальная цена продажи – **11616** рублей, в т. ч. НДС – 1936 руб.

Лот № 5. Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4731, расположенное по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Боровика, 44Б-5, начальная цена продажи – **11712** рублей, в т. ч. НДС – 1952 руб.

Лот № 6. Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4732, расположенное по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Боровика, 44Б-6, начальная цена продажи – **15264** рубля, в т. ч. НДС – 2544 руб.

Лот № 7. Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4733, расположенное по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Боровика, 44Б-7, начальная цена продажи – **15264** рубля, в т. ч. НДС – 2544 руб.

Лот № 8. Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4735, расположенное по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Боровика, 44Б-8, начальная цена продажи – **15456** рублей, в т. ч. НДС – 2576 руб.

Лот № 9. Тепловоз ТГМ-4, № 2435 с инвентарным № 1081922 адресу: Минская обл. Любанский р-н, Юшковичский с/с, 2/2 начальная цена продажи **95357** рублей, в т. ч . НДС – 15893 руб.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.07.2018 г.

Аукцион состоится 12.09.2018 в 12.00 по адресу: Минская обл., Любанский р-н, п/о Смольгово (филиал № 6 «Любанский КСМ»).

Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с № BY29BPSB30121505440129330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBB2. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.

Заявление на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 10.09.2018 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 62, оф. 910. Заключительная регистрация участников – 12.09.2018 с 10.00 до 11.45 по месту проведения аукциона.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-29-44, +375 29 615-40-08 e-mail: belinvo@tut.by

Извещение о проведении 8 октября 2018 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «СУКНО»

Предмет торгов
Половина фермы из швеллера 6,5 и 8; длина 10 м, гост 8240-89, 22 ед. (инв. № 900064); стойка из трубы квадратной 100 мм, длина 6 м, гост 8639-82 (инв. № 900058), 1 ед.; стойка из трубы квадратной 100 мм, длина 3,5 м, гост 8639-82, 10 ед. (инв. № 900059); стойка из трубы квадратной 100 мм, длина 2,5 м, гост 8639-82, 5 ед. (инв. № 900060); стойка из двутавра 16, длина 7,5 м, гост 8240-89, 2 ед. (инв. № 900061); стойка из двутавра 16, длина 5 м, гост 8240-89, 14 ед. (инв. № 900062); стойка из двутавра 16, длина 3 м, гост 8240-89, 1 ед. (инв. № 900063)
Местонахождение – г. Минск, ул. Матусевича, 33
Начальная цена – 4 049,00 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка – 810,00 бел. руб.
Сумма шага аукциона – 202,45 бел. руб.

Продавец имущества – ОАО «СУКНО», ул. Матусевича, 33, 220121, г. Минск, телефон (017) 363-99-40.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-05-62.

Торги проводятся в порядке, установленном Законом Республики Беларусь «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Условие торгов: победитель торгов (претендент на покупку) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, а также возмещает затраты на организацию и проведение торгов в течение 5 дней со дня проведения торгов на расчетный счет организатора торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до наступления даты их проведения.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный срок заявление на участие в торгах (по форме, установленной организатором торгов) с приложением следующих документов:

– заверенного банком документа о внесении задатка;

– копии свидетельства о государственной регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей);

– легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в торгах) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности (для организаций – нерезидентов Республики Беларусь).

Физические лица, индивидуальные предприниматели предъявляют организатору торгов документ, удостоверяющий личность; представители физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляют организатору торгов оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. Протокол о результатах торгов подписывается победителем торгов (претендентом на покупку) в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (претенденту на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (претендентом на покупку) подписывается в течение 10 дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (претендентом на покупку) с учетом НДС в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Торги проводятся 8 октября 2018 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 06.09.2018 по 04.10.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом (предметом торгов) следует обращаться по телефону: (044) 501-62-28.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(044) 501-62-28 (ОАО «СУКНО»)

ЧАС МАГЧЫМАСЦЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пра магіляўчанку Алесю Цумараву і яе праект «Тэрыторыя людзей» «Звязда» ўжо пісала. На конкурсе прадпрымальніцкіх ідэй на ўзроўні рэспублікі праект быў прызнаны найлепшым сярод сацыяльных. Яго мэта — даць людзям з абмежаванымі магчымасцямі шанц зарабіць сабе на жыццё і адначасова прынесці карысць грамадству. Ад моманту перамогі на конкурсе да адкрыцця крамы ў Магілёве прайшло ўсяго паўтара года. За гэты час Алеся скончыла безліч курсаў па інтэрнэт-маркетынгу, SMM-прасоўванні і шмат чым іншым. А яшчэ навучылася тынкаваць і разбірацца ў будаўнічых матэрыялах. Бо тое памяшканне па вуліцы Першамайскай, якое выдзелілі пад яе сацыяльны праект, трэба было з паўпадвальнага пераўтварыць у прыдатнае для так званага клуба па інтарэсах. Яшчэ шмат чаго трэба зрабіць, але месца, дзе можна рэалізаваць сувенірную прадукцыю, правесці майстар-клас або арганізаваць навучанне, створана. Урачыстае адкрыццё адбылося на мінулым тыдні.

Чалавек з іншай планеты

Каб навучыцца хадзіць, Алеся перанесла ў дзяцінстве 14 аперацый. Жыццё яе наогул не шкадавала. Яна рана страціла маці, перажыла развод з любімым чалавекам. Але не зламалася. У 35 гадоў пачала жыццё з новага ліста — выйшла замуж і заявіла на конкурс свой праект.

Спачатку думала зрабіць нешта выключна для сябе, але потым рызыкнула стаць карыснай і для іншых. У магілёўскай бізнес-школе ІПМ, куды яна звярнулася, праектам зацікавіліся і дапамаглі ўдасканаліць яго. У выніку ён быў прызнаны найлепшым спачатку на абласным, а потым і на рэспубліканскім узроўні.

На жаль, рэалізаваць яго аказалася больш складана, чым распрацаваць. Грошай катастрафічна не хапала. Было вельмі цяжка і беспрасветна. Ад адчаю яна нават напісала ліст Ніку Вуйчычу. Калісьці была на яго выступленні і нават паспрачалася з ім. Але настаў момант, калі ёй вельмі спатрэбілася яго парада: ці будзе мець поспех яе праект? І ён адказаў: Алеся, ты малайчына. Выйдзеш на міжнародны ўзровень, нагадай пра сябе. Запросім на сустрэчу.

Наогул Алесі вельмі пашчасціла з людзьмі. І першы, хто яе падтрымаў, быў, вядома, муж — Сяргей. Яна кажа, што яго ёй паслаў Бог. Бо яны і пазнаёміліся якраз у той момант, калі ў яе зарадзіліся думкі пра «Тэрыторыю людзей». Ён звярнуў увагу на яе незвычайнае рэзюмэ ў інтэрнэце. Жанчына пісала, што яна інвалід — у яе ДЦП, а з фота глядзела прыгожая незнаёмка. Дамовіліся аб сустрэчы і з тых часоў болей не расставаліся.

«Я раней думаў, што інваліды — гэта людзі з іншай планеты, але пасля сустрэчы з Алесяй зразумеў: розніцы паміж намі няма», — усміхаецца Сяргей.

Шчаслівыя разам

На палічках — сімпатычныя лялькі, карціны, сурвэткі. Іх аўтары — выключна людзі з абмежаванымі магчымасцямі. Да нядаўняга часу ўсё гэта захоўвалася ў Алесінай кватэры.

Алеся з мужам прымаюць падарункі.

Тое, што праект унікальны, падкрэсліваюць усе — і прадстаўнікі ўлады, і дэпутаты, і прадпрымальнікі, і тыя, для каго гэта ўсё стваралася. У адрозненне ад камерцыйных крам, якія існуюць для таго, каб зарабляць грошы, сацыяльныя пераследуюць мэту даць рэалізавацца іншым. І без падтрымкі звонку такое доўга не праіснуе.

Каб цалкам прысвяціць сябе справе, яна звольнілася з бібліятэкі і вяла гурток рукадзелля для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў Ленінскага раёна. А каб рэалізаваць хэнд-мэйд свой і знаёмых, пачала вывучаць попыт праз інтэрнэт. Хутка да Алесі далучыліся ўмельцы з Мінскай, Брэсцкай абласцей.

— Калі гэты праект закруціўся, прыпыняцца было ўжо позна, — расказвае Сяргей. — І нас панесла далей, у нас пачалі верыць людзі з інваліднасцю, чакаць адкрыцця гэтай крамы. Алеся нават жартавала, што калі адмовіцца ад задумкі, трэба будзе мяняць пол, знешнасць, прозвішча і з'язджаць. Для яе гэта стала справай гонару.

— Не крыўдна, што Алеся цалкам прысвяціла сябе сваёй ідэі замест таго, каб аддаць вам свой вольны час? — спрабую справакаваць Сяргея.

— Тое, што ў Алесі ёсць мэта, гэта цудоўна. Я не думаю, што ўвесь свой час яна павінна прысвячаць мне. Я хачу зрабіць яе шчаслівай, а яна — мяне. У нас ужо нават саперніцтва: хто каго больш ашчасліваць. Калі нам толькі выдзелілі гэта памяшканне, мы... засумавалі. Толькі на адну электрыку трэба было знайсці дзесьці паўтары тысячы долараў. У выніку не ўклалі ні капейкі. Дзякуй спонсарам — гарадской уладзе, дэпутатам, бізнесменам. Гэта яны дапамаглі давесці памяшканне да патрэбнага стану. Шмат дапамагаюць і інваліды, якія хочуць, каб цэнтр працаваў. Яны прыходзілі і працавалі толькі для таго, каб мы хутчэй адкрыліся.

У Алесінай краме будзе прадавацца хэнд-мэйд з усяго свету.

Усім мірам

Тое, што праект унікальны, падкрэсліваюць усе — і прадстаўнікі ўлады, і дэпутаты, і прадпрымальнікі, і тыя, для каго гэта ўсё стваралася. У адрозненне ад камерцыйных крам, якія існуюць для таго, каб зарабляць грошы, сацыяльныя пераследуюць мэту даць рэалізавацца іншым. І без падтрымкі звонку такое доўга не праіснуе. Асаблівасць Алесінага праекта ў тым, што яго чакалі. І таму дружна падставілі плячо. На адкрыццё прыйшло шмат каго з ліку гэтых людзей. Напрыклад, часткова мэбля ў краме — гэта дапамога Магілёўскай **абласной арганізацыі Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа. Старшыня арганізацыі Андрэй МАРТЫНОЎСКІ** асабіста завітаў павіншаваць шчаслівую «прадпрымальніцу».

— Аказанне дапамогі ўразлівым катэгорыям насельніцтва, людзям з абмежаванымі магчымасцямі, шматдзетным сем'ям — адна з першачарговых задач нашай грамадскай арганізацыі, — адзначыў ён. — Вельмі радасна, што ў дадзеным выпадку чалавек з'яўляецца не проста пасіўным атрымальнікам дапамогі, але яшчэ і сам імкнецца быць карысным іншым. Гэта наватарскі праект, і вельмі важна, каб ён развіваўся і прагрэсіраваў. Мы і надалей будзем супрацоўнічаць і ўзаемадзейнічаць.

Адной з першых Алесін праект падтрымала **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Вольга ПЕТРАШОВА**.

— Алеся прыйшла да мяне на прыём год таму. Прынесла шмат сваіх вырабаў і — бізнес-план — вельмі дэталёвы, сур'ёзны і прафесійны. Расказала, які важны гэты праект, і папрасіла дапамагчы яго рэалізаваць, — успамінае дэпутат. — Першапачаткова Алесі далі пляцоўку па Пушкінскім праспекце, але арэнда там была занадта высокая. І я патэлефанавала мэру, папрасіла садзейнічання. Алеся пабывала ў яго на прыёме, і на працягу тыдня новая пляцоўка была прапанавана. Потым да справы далучыўся старшыня аблсавета дэпутатаў, дэпутаты гарсавета, прадпрымальнікі. Справа важная. За плячыма Алесі інваліды не толькі вобласці — усёй рэспублікі. Яе праект запатрабаваны, у яго вялікая будучыня. Будзем дапамагаць ёй і далей. Нам яшчэ шмат прыйдзецца працаваць і па стварэнні тут безбар'ернага асяроддзя.

— Алесін праект быў асуджаны на поспех, — кажа **дырэктар магілёўскага прадстаўніцтва бізнес-школы ІПМ Ганна ПЕРУНОВА**. — Тут было адчуванне не проста праекта, а лідара. Праектаў падаецца шмат, у тым ліку і перспектыўных, але, калі імі не займацца і не развіваць, гэта ні да чога не прыводзіць. Першае выступленне на публіцы давалася Алесі нялёгка, але яна змагалася і ішла наперад. Упэўнена, што праект жыве толькі дзякуючы ёй і Сяргею. Алеся магла павесіць на сцяну дыплом, які атрымала, і нічога не рабіць. Але яна ў сваіх марах бачыла менавіта «тэрыторыю людзей», пляцоўку, дзе можна знаходзіцца і развівацца.

Тры ў адным

Творчы цэнтр складаецца з трох модуляў: крама для рэалізацыі сувеніраў інвалідаў (як удакладняе Алеся, з усяго свету), клуб для тых, хто шукае працу, і студыя прыгажосці.

— Мы будзем даваць магчымасць рабятам прайсці адукацыю па запатрабаваных прафесіях, — кажа Алеся. — Мы навучым, як прадаваць свае сувеніры, працаваць у інтэрнэце, арганізаваць свой бізнес і весці яго на адлегласці. Праз нас ужо рэалізуюць свае вырабы жыхары Магілёўскай, Брэсцкай абласцей, Мінска. Нядаўна пажадалі далучыцца малдаване. Студыя прыгажосці для інвалідаў таксама ўнікальная з'ява. Хачу падняць імідж магілёўскіх дзяўчат-інвалідаў. Незалежна ад інваліднасці, кожны хоча быць прыгожым і запатрабаваным.

У краме шмат сувеніраў з беларускай сімволікай.

Каб навучыцца хадзіць, Алеся перанесла ў дзяцінстве 14 аперацый. Жыццё яе наогул не шкадавала. Яна рана страціла маці, перажыла развод з любімым чалавекам. Але не зламалася. У 35 гадоў пачала жыццё з новага ліста — выйшла замуж і заявіла на конкурс свой праект.

Шэфства над школай прыгажосці бярэ кампанія «Фаберлік».

— Асноўная наша задача — паказаць людзям з абмежаванымі магчымасцямі, што яны таксама прыгожыя і могуць стаць яшчэ прыгажэйшымі, — кажа прадстаўнік гэтай фірмы бабруйчанка Вольга Кавалеўская. — Будзем навучаць на прафесійным узроўні візажу, стварэнню вобраза, прычоскі. Збіраемся ўнесці ў жыццё інвалідаў шмат яркіх фарбаў.

Дарэчы, у снежні Алеся і яе аднадумцы збіраюцца правесці ў Магілёве пры спонсарскай падтрымцы кампаніі першы конкурс прыгажосці сярод жанчын з інваліднасцю.

Амбіцыйная магіляўчанка між тым ужо марыць выходзіць на міжнародны ўзровень. І падставы для гэтага ёсць.

— З намі ўжо выказалі жаданне супрацоўнічаць Польшча, Расія. Зараз вядзём перагаворы з Масквой. На мяне выйшаў дэпутат і паведаміў, што яму падабаецца мой праект і ён бы хацеў бачыць нешта падобнае ў Маскве. Не выключана, што ўслед за нашай «Тэрыторыя людзей» паявіцца і ў Казахстане, — кажа Алеся. — Я шчаслівая, што менавіта Магілёў стаў пунктам адліку. У Магілёве 18 тысяч інвалідаў, у вобласці — 54 тысячы, у краіне — 860 тысяч. І шмат хто з іх можа прыносіць радзіме карысць. У мяне адказнасць перад гэтымі людзьмі, я не магу ім проста сказаць: прабачце, нічога не атрымалася. Калі Нік Вуйчыч змог, мы таксама зможам. Гэта той выпадак, калі людзі хочуць працаваць. Нельга пазбаўляць іх надзеі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

P. S. ***Вы таксама можаце далучыцца да добрай справы і падтрымаць Алесін праект. Вось яе рэквізіты:***

IBAN BY20ALFA30132231730040270000
СВИФТ-ALFABY2X

У ЧЫМ, БРАТ, СІЛА?

Як гродзенскі гіравік стаў трохразовым чэмпіёнам свету

Магчыма, нашчадкі скажуць, што Яўген Назарэвіч каня на плячах насіў і вагоны на гродзенскай чыгунцы рукамі пераварочваў. Як-ніяк ён зорка гіравога спорту. Падняць амаль 35 тон за гадзіну — гэта не жарты. За спінай — 20 сусветных рэкордаў Гінеса, пяць з якіх — у асабістай катэгорыі. Трохразовы чэмпіён свету. Чалавек з характарам магутным, як яго мускулы, Яўген валодае яшчэ і сакрэтам невычарпальнай энергіі. Удзень — на арматурным участку завода, з вечара і да ночы — у спартыўнай зале. І заўсёды — пераможца. Жалезны ён ці не? Сказаць цяжка, але тое, што Яўген Назарэвіч сабраў усе магчымыя тытулы і званні ў гіравым спорце, — гэта факт. Спецыяльна для «Звязды» гродзенец адкрыў сваю спартыўную праўду, расказаў, чаму гіра — сябар ад калыскі да глыбокай старасці і ці спрыяльны прагноз у гэтага спорту на Беларусі.

ЗОРНЫ ШЛЯХ

«Любоў да жалеза была са мной заўжды», — прызнаецца Яўген Назарэвіч, азіраючыся на вучобу ў родным Шчучыне ў прафесійна-тэхнічным вучылішчы, на службу ў арміі і працоўнае жыццё пасля яе. Хоць тады не верылася, што лёс наканаваў яму рэдкую дарогу.

«Знешне ты вельмі моцны», — ацанілі яго і запрасілі на абласную спартакіяду будаўнікоў. Першы раз — першае месца. І вось ужо 11 гадоў гродзенец здабывае залатыя медалі ў гіравым спорце. Тут і жым, і штуршок. Нават трохгадзінныя марафоны з гірамі ад двух да шасцідзесяці (!) кілаграмаў.

«На саракавой хвіліне змагання за рэкорд Гінеса, калі рукі ўжо сцёртыя да крыві, я адключаю сябе ад рэчаіснасці. Гэта псіхалагічны наркоз, каб дапрацаваць марафон да канца. Мякка кажучы, не самыя прыемныя адчуванні ў маім жыцці, — усміхаецца герой і дадае: — Вось чаму найвялікшае значэнне ў маіх вачах мае кожны рэкорд».

Прыёмам рывок за гадзіну беларус падняў амаль 35 тон. Больш за тысячу разоў узнімалася рука з гірай. Як ні намагаліся ірландзец і амерыканец пабіць паказчык гродзенца — усё марна. Яўген кажа, калі яго рэкорд паб'е беларус, будзе толькі рады. А ліпеньскія выступленні на чэмпіянаце свету ў Італіі прынеслі тры залатыя медалі.

«Кожны з нас змагаецца за каманду. Іншаземцы бачаць гэта і, я бы сказаў, паважаюць, цэняць. Паверце, сапернікі мы толькі на памосце. А так спаборніцтвы — цёплыя сустрэчы старых-новых сяброў. І нават слабае веданне замежных моў не псуе агульнай карціны. Я вось вязу сувеніры, буклеты з радзімы, каб кожны ведаў, якая ў нас прыгожая краіна», — кажа спартсмен.

ЖАЛЕЗНЫЯ ЛЕГЕНДЫ

«Мой тата — воін-інтэрнацыяналіст. На жаль, яго ўжо няма, загінуў. Ён быў фізічна вельмі развітым чалавекам, салдат навучаў. І канешне, інтарэс да спорту бацька мне перадаў разам з добрай генетыкай, — успамінае гіравік. — Гэта ён прывіў мне працавітасць. Я зараз гавару не пра спорт, а пра стаўленне да любой справы. Тата казаў, каб выконваў работу на 200 %. Усе таленавітыя, а працавітыя — адзінкі».

Цяжка сказаць, чаму Яўген Назарэвіч такі, які ён ёсць. Але хоць спартсмен і цытуе біблейскі наказ «не зрабі сабе куміра», захапленне ў вачах падчас размовы пра свайго легендарнага трэнера ён, канешне, схаваць не можа: «Такіх людзей, як Анатоль Яжоў, у жыцці я больш не сустракаў. Сваім прыкладам ён паказаў, што ўсе бар'еры сціраюцца ў галаве. «Ты можаш!» — гэта галоўнае. Анатоль Мікалаевіч — мой духоўны настаўнік і ў спорце, і па-за ім... Можа, гэта так, таму што я рана страціў бацьку».

«Вядома, я паважаю такіх вялікіх спартсменаў, як Паддубны, Гакендшміт. Мажліва, праз стагоддзе і пра Назарэвіча скажуць, што каня на плячах насіў ці чыгуначныя вагоны пераварочваў. Легенды, яны ж ствараюцца так. Безумоўна, гэтыя людзі былі моцныя. Але некаторыя дэталі нашчадкі дамалявалі самі. З сучаснікаў не можа не захапляць Іван Ціхан. Нядаўна памерлы Аляксандр Курловіч быў жалезны чалавек», — заўважае гіравік.

Яўген Назарэвіч працуе электразваршчыкам на арматурным участку прадпрыемства «Гроднапрамстрой». Быў перыяд, калі трэніраваўся цэлую ноч — да пяці ранку, бо ў сем пачыналася праца. Кіраўніцтва пайшло насустрач, і цяпер спартсмен падымае гіры ўвечары. Ён вырас на гэтым прадпрыемстве ад звычайнага аматара схадзіць у трэнажорку да чэмпіёна свету. Сабраў усе тытулы і званні, якія толькі магчымы на сённяшні дзень. Але з рабочай прафесіяй развітвацца не збіраецца.

«Думаю, грэбаваць рабочымі спецыяльнасцямі неразумна, — кажа герой. — У любой сферы чалавек можа стаць паважаным. Я многае раблю рукамі. І канешне, мая вышэйшая адукацыя са мною. І хоць менеджментам не займаюся, але агульны ўзровень універсітэт даў. Вось мой сын хоча быць кухарам. А іх падрыхтоўваюць толькі ў вучылішчах. Няхай будзе кухарам! Я не супраць».

ГІРА ДЛЯ ЎСІХ І КОЖНАГА

«Ці іграе ролю ў гіравым спорце генетыка? Кажуць, Паддубны нарадзіўся асілкам», — пытаюся.

«Ну канешне! Шырыня косці, сіла мышцаў. Калі гэта было б няважным, то чэмпіёнаў стала б што дрэў у лесе. Нават антрапаморфныя асаблівасці: у каго рычаг рукі меншы, таму лягчэй падымаць. Хапае невысокіх спартсменаў. У іх гіра практычна над галавой вісіць. Рукі кароткія, амплітуда выштурхвання нашмат меншая, чым у высокага з рукамі па калені. А ў часавым рэгламенце з падлікам тэмпу — гэта проста падарунак прыроды», — усміхаецца Яўген.

Плывец не стане лыжнікам, а лыжнік — плыўцом. Але! Што датычыцца гіравога спорту, гіравік — салдат універсальны. У так званых зарубах паміж кросфіторамі і гіравікамі апошнія перамагаюць. Хоць і ў першых таксама развіта функцыянальная вынослівасць. Але тым не менш цяжкаатлет гіравіком не стане, а гіравік цяжкаатлетам — калі ласка. На думку Яўгена Назарэвіча, гіравы спорт дазваляе разумна развіць сваё цела на карысць здароўю.

Можна смела заявіць, што спорту гэтаму ўсе ўзросты пакорныя. Малодшы сын беларускага чэмпіёна таксама падымае гіру на спаборніцтвах, а яму — увага! — 14 гадоў, а займаецца ён ужо далёка не першы год. Самы стары гіравік, якога бачыў Гродна, — 91-гадовы (!) латыш Паўлюс Гіліс. Таму не дзіва, што Яўген і ў 60 бачыць сябе з гірай. Кажа, што і ў 100, калі дажыве, падыме.

«Гэта класна! Я ўсім рэкамендую. Вось зараз адпачкаваўся гіравы трыятлон. Выступаюць нават у экстрэмальных умовах. На Эльбрус падымаюцца, дзе кіслароднае галаданне, у пустыню. Навошта? Даказаць, што магчымасці чалавечага цела не маюць межаў, — расказвае Яўген. — З'яўляюцца сілавыя спартыўныя шоу-праграмы, сілавое жангліраванне. Выходзіць дзяўчына кілаграм 50 разам з кедамі і жангліруе пудовай гірай, выкідваючы яе ўгору на метраў пяць і ловячы з піруэтамі».

Сёння гэта патэнцыйна самы алімпійскі від спорту. Штогод Беларусь высаджвае на спартыўныя арэны дэсант супергіравікоў, а таму за намі — суперперамогі. Так, землякі ў масавым гіравым спорце трымаюць планетарнае першынство. Гэта беларусам належаць дасягненні ва ўсіх намінацыях, прызнаных штаб-кватэрай Кнігі рэкордаў Гінеса ў Лондане. Гэта беларусы разам з расіянамі вязуць дахаты найбольш медалёў з чэмпіянатаў.

А пакуль наша міжнародная федэрацыя гіравога спорту традыцыйна праводзіць спаборніцтвы «Гіра без межаў», дзе выступаюць як спартсмены высокіх дасягненняў, так і навічкі. Гэта адзіная федэрацыя, якая папулярызуе масавы спорт, калі выступаюць і параалімпійцы, і цэлыя сем'і ад унука да дзеда з гірамі рознай вагі адпаведна. Дарэчы, багаты на такія мерапрыемствы Віцебск. Там праходзілі многія чэмпіянаты. А Яўген Назарэвіч на наступны год плануе чэмпіянат свету ўжо ў Гродне.

Цела гіравіка не будзе перакачаным, як у бодзібілдара. Не, яно хутчэй нагадае грэчаскага «Дыскабола». Ды і дзяўчатам ёсць пра што задумацца: гіра — мегапапулярны снарад у фітнесе, які дае раўнамерную нагрузку на ўсе мышцы, развівае вынослівасць, а галоўнае — хутка пазбаўляе ад лішніх кілаграмаў. І сёння многія жанчыны, што выступаюць на спаборніцтвах з 24-кілаграмовай гірай, паказваюць вынікі, да якіх моцнай палавіне чалавецтва расці і расці.

НА ПЛАЦДАРМЕ ДУШЫ

«Ці глядзіць жонка вашы выступленні?» — цікаўлюся.

«Не! Яна не можа сачыць за імі. Кажа: «Я не магу глядзець, як табе цяжка». Я ж тлумачу, што цяжка мне ў апошні момант, а ў пачатку, канешне, лёгка. *(Усміхаецца.)* А калі сур'ёзна, нават нягледзячы на рэўнасць да спорту з-за маёй частай адсутнасці дома, яна мяне вельмі падтрымлівае», — адказвае гіравік.

Апошнія тры гады спартсмен жыве ў шчыльным ланцужку спаборніцтваў. Цяпер Яўген Назарэвіч ужо адной нагой на адкрытым чэмпіянаце ЗША, што адбудзецца ў Лас-Вегасе ў межах сусветна вядомага фестывалю «Містар Алімпія». Адпачываць не атрымліваецца. Статус чэмпіёна важыць нямала, і яго гродзенец хоча ўтрымаць на плячах. Тут славалюбства няма ні на грам. Выступленне за каманду, за родную краіну і самае простае жаданне, каб ганарыліся свае дзеці, каб у Шчучыне ганарылася мама, якая збірае кожную газетную выразку пра свайго сына.

Маргарыта САДОЎСКАЯ.

■ Выстаўка

НА ПАМЯЦЬ АБ СЛУЖБЕ

Незвычайная выстаўка адкрылася ў магілёўскім Музеі этнаграфіі. Яе экспанатамі сталі здымкі і фотакалажы з армейскіх фотаальбомаў перыяду 1960—1980-х гадоў.

Кранальныя і гераічныя, камічныя і ўрачыстыя, будзённыя і святочныя — яны прывабліваюць перш за ўсё сваёй непасрэднасцю і шчырасцю. Гэта своеасаблівае салдацкае мастацтва, спроба перадаць той дух і атмасферу, якія панавалі сярод вайскоўцаў падчас іх службы. І вядома, зрабіць гэта крыху з ухілам у героіку і рамантызм. Бо ствараўся альбом з мэтай не толькі захаваць успаміны аб гэтым адрэзку жыцця, але і пакінуць уражанні.

Звярнуцца ўладальнікаў гэтых здымкаў да сваіх архіваў натхніў сумесны фотапраект трох творчых калектываў — сталічнага народнага фотаклуба «Мінск», а таксама «Студыі 3plus» і клуба фотамастакоў «Вясёлка» з Магілёва.

— Мода на такія альбомы з'явілася ў СССР у 1960-я гады, калі ў грамадстве пачалося некаторае «пацяпленне» і прайшла рэформа ў войску, — расказвае **куратар фотапраекта «Дэмбельскі фотаальбом» Ірына САВОСІНА.** — Традыцыя нарадзілася ў салдацкай масе як адказ на адноснае абязлічванне звычайнага вайскоўца, калі салдат — толькі вінцік ваеннай машыны. Удзельнікамі выстаўкі сталі члены фотастудый і звычайныя магіляўчане.

Арганізатары спадзяюцца, што фота ў сямейных альбомах з подпісам: «На памяць аб службе» не згубяцца і з часам набудуць музейную каштоўнасць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.



■ Скажыце, доктар...

ДЫЯГНАЗ З ХУТКАСЦЮ ГУКУ

Ультрагукавое даследаванне, бадай, самы папулярны сёння дыягнастычны метад. Бяспечны, бязбольны і вельмі інфарматыўны. Сучасныя магчымасці ўльтрагуку непараўнальна вышэйшыя, чым раней. Калі яшчэ два дзесяцігоддзі таму УГД «умела» выяўляць камяні ў нырках, то зараз практычна не засталося хвароб, здольных схавацца ад чуйных хваль.

Дзякуючы сучаснай УГД-апаратуры паступова адыходзяць у мінулае некаторыя траўматычныя метады даследавання. Напрыклад, каб праверыць стан печані і нырак, сёння не трэба ўводзіць у артэрыі кантраснае рэчыва, цалкам дастаткова аднаго ўльтрагуку. Тым жа бяскроўным спосабам можна абследаваць лімфатычную сістэму, сэрца і сасуды. Якія віды УГД мы павінны рабіць рэгулярна і чаму яго ўсё роўна павінен прызначаць урач, а таксама рак якіх лакалізацый можна выявіць з дапамогай ультрагуку, расказаў загадчык кабінета ультрагукавой дыягностыкі 11-й гарадской паліклінікі горада Мінска Міхаіл МАЁРАЎ.

— З дапамогай УГД сёння можна абследаваць амаль увесь арганізм. Захворванні падстраўнікавай і шчытападобнай залоз, жоўцевага і мачавога пузыра, жоўцевых пратокаў, малочных залоз — ультрагук выяўляе практычна любыя парушэнні, замяняючы сабой многія віды рэнтгену і такім чынам дапамагаючы пазбегнуць промневай нагрузкі. Ёсць методыкі, якія дазваляюць абследаваць нават полыя органы — той жа страўнік, яго агляд выконваецца з напаўненнем, хоць у дадзеным выпадку больш інфарматыўная фібрагастрадуадэнаскапія, або страўнікавы зонд. Абследаваць ультрагукам можна і мяккія тканкі, і сасуды, і косную сістэму.

— Якія віды УГД патрабуюць спецыфічнай падрыхтоўкі?

— Найперш абследаванне органаў брушной поласці. За восем гадзін да працэдуры нельга ўжываць ежу, дзень-два трэба прытрымлівацца спецыяльнай дыеты, якая змяншае газаўтварэнне ў кішэчніку. Акрамя гэтага, могуць прымяняцца такія прэпараты, як эспумізан, фортранс, якія разбураюць газавыя пузыркі ў страўніку і кішэчніку, што спрыяе паляпшэнню бачнасці. Падрыхтоўка патрабуецца і перад УГД мачавога пузыра — за 30 хвілін да працэдуры трэба выпіць 1-1,5 літра вадкасці, бо пузыр павінен быць напоўнены, як і падчас абследавання нырак па пэўных методыках. Астатнія віды УГД не прадугледжваюць ніякай спецыфічнай падрыхтоўкі.

— УГД якіх органаў варта рабіць рэгулярна?

— Жанчынам — малочных залоз. Мужчынам — прастаты, але гэта ў дадатак да аналізаў, у прыватнасці крыві на ПСА. Таксама ўрач прызначае даследаванне для ўдакладнення дыягназу ці назірання за захворваннем. У прыватнасці, назірання патрабуюць хваробы печані — гепатыт ці цыроз, хранічны панкрэатыт, жоўцекамянёвая хвароба, хранічны піеланефрыт, пэўныя захворванні жаночай моча-палавой сістэмы, шчытападобнай залозы, атэрасклероз сасудаў ніжніх канечнасцяў, захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы, у прыватнасці кардыяміпатыя. Калі хворы перанёс інфаркт, таксама з пэўнай перыядычнасцю прызначаецца УГД. Анкалагі ў залежнасці ад стадыі захворвання накіроўваюць на абследаванне раз на тры, шэсць або дванаццаць месяцаў.

— Якія захворванні, у тым ліку рак якіх лакалізацый часцей за ўсё вызначаюць па УГД?

— Камяні ў нырках і жоўцевым пузыры, атэрасклерозы, трамбозы, востры панкрэатыт, некроз падстраўнікавай залозы, пэўныя вострыя паталогіі, нават запаленне апендыкса, новаўтварэнні жаночай палавой сферы. Што датычыцца анкалагічных хвароб, то выяўляюцца рак ныркі, яечнікаў, мачавога пузыра, мачаточніка, падстраўнікавай залозы, малочнай залозы, шчытападобнай залозы, праўда, для яго ўдакладнення варта рабіць біяпсію.

— Некаторыя лакалізацыі раку з названых вамі, у прыватнасці рак падстраўнікавай залозы самі анколагі называюць адным з тых, якія складана дыягнаставаць...

— Вопытны спецыяліст заўважыць гіпарэхагеннае ўтварэнне, што дае падставу западозрыць новаўтварэнне і накіраваць на камп'ютарную тамаграфію. Там дыягназ пацвярджаецца або не. У любым выпадку для ўдакладнення дыягназу пры падазрэнні на анкалогію мы накіроўваем пацыента на экспертнае УГД у сталічны кансультацыйна-дыягнастычны цэнтр, там больш дасканалае абсталяванне.

— УГД варта рабіць па прызначэнні ўрача або пры жаданні можна абследавацца самастойна?

— Канешне, пажадана, каб вас накіроўваў урач. Калі вырашылі абследавацца, спачатку трэба здаць лабараторныя аналізы, зрабіць электракардыяграму. Калі пацыент сябе добра адчувае, кардыяграма ў норме, навошта яму рабіць УГД сэрца? Тое ж датычыцца сасудаў канечнасцяў — калі няма болевых адчуванняў і варыкозу, няма патрэбы рабіць УГД вен.

— Тую ж шчытападобную залозу, якая не выклікае болевых адчуванняў, ці варта абследаваць?

— Таксама гэта вызначае лечачы ўрач, які падчас візуальнага абследавання робіць высновы. Праўда, тут можна памыліцца з-за асаблівасцяў шыі. Падчас пальпацыі здаецца, што шчытападобная залоза павялічана, УГД ж паказвае, што яна ў норме.

— Якія памылкі мы робім, прыходзячы на УГД?

— Ёсць пацыенты, якія праходзяць адно і тое ж абследаванне да чатырох разоў за год, абсалютна не маючы на тое патрэбы. Гэта надумлівыя людзі, якія пойдуць нават у іншую паліклініку, платны цэнтр, затым параўнаюць вынікі, знойдуць нейкую дробязь і будуць зацыкліваццца на ёй. Тут лечачы ўрач павінен растлумачыць, што няма неабходнасці ў частым абследаванні без падстаў. Гэтаксама як і не трэба абследаваць, скажам, сасуды брахіяцэфальнай зоны (шыі), калі няма адпаведных скаргаў

■ Сітуацыя

ЦІ ТРЭБА БАЯЦЦА ПРЫШЧЭПАК?

Трагедыя ў Ганцавіцкім раёне, калі пасля прышчэпкі загінуў ад анафілактычнага шоку двухмесячны хлопчык, выклікала ў грамадстве вялікі рэзананс. Медыкі апасаюцца, што такая сітуацыя можа прывесці да масавых неспрыяльных наступстваў. У прыватнасці, адмова ад прышчэпак прывядзе да зніжэння калектыўнага імунітэту і распаўсюджання інфекцыйных хвароб. Бацькі ж, у сваю чаргу, таксама разгубленыя: ці варта ўвогуле рабіць прышчэпкі, калі гэта так небяспечна?

РЭАКЦЫЯ ЦІ ЎСКЛАДНЕННЕ

Найперш трэба адрозніваць, што ёсць рэакцыя на прышчэпку, а ёсць ускладненні. Рэакцыя на прышчэпку бывае ў 10—20 % дзяцей. З чым гэта звязана? Мы ўводзім чужародныя рэчывы — «забітыя» ці аслабленыя бактэрыі і вірусы ці «кавалачкі забітых» мікраарганізмаў. Імунная сістэма адказвае тым, што выпрацоўвае спецыяльныя бялкі (іх называюць антыцелы) і ўтварае клеткі-«забойцы», якія далей пры сустрэчы з узбуджальнікамі абароняць ад іх арганізм. Падчас гэтых складаных працэсаў выпрацоўваюцца патрэбныя імуннай сістэме рэчывы, якія могуць выклікаць павышэнне тэмпературы і невялікую інтаксікацыю.

Але важна ведаць, што рэакцыі на прышчэпку заўсёды ўзнікаюць у пэўны час. Калі мы ўводзім вакцыну, дзе няма жывога віруса, рэакцыя ўзнікае **ў першыя ж суткі і на трэці дзень дзіця адчувае сябе нармальна.** Калі ж недамаганне, тэмпература з'явяцца пазней ці будуць трымацца даўжэй за тры дні — гэта ўжо не рэакцыя на прышчэпку. Такі стан азначае, што дзіця адначасова з прышчэпкай захварэла, і трэба высветліць на што.

Калі мы ўводзім жывыя вакцыны, недамаганне ўзнікае з 5-га па 14-ы дзень. Ні ў якім разе не ў 1—4-ы дзень!

Рэакцыя на прышчэпку праходзіць сама і не патрабуе лячэння, не пакідае ніякіх наступстваў. Але калі тэмпература высокая (вышэйшая за 38—38,5), трэба даць дзіцяці гарачкапаніжальнае, паколькі пры высокай тэмпературы могуць узнікаць сутаргавыя станы, і выклікаць урача, каб ён выключыў далучэнне якога-небудзь захворвання. Высокая тэмпература пасля прышчэпак узнікае ў 1—4 % дзяцей. Магчымае з'яўленне ацёку і пачырванення ў месцы прышчэпкі, такія рэакцыі праходзяць самі на працягу некалькіх дзён.

А ўскладненні пасля прышчэпак — гэта сур'ёзная сітуацыя, напрыклад цяжкая алергічная рэакцыя на кампаненты вакцыны. Але яны здараюцца рэдка. Напрыклад, крапіўніца здараецца адзін раз на 30—50 тысяч доз.

МІФЫ ПРА ПРЫШЧЭПКІ

Міф 1. Вакцынацыя вядзе да інвалідызацыі

У часопісе Lancet («Лансет») у 1998 годзе была надрукавана праца вучонага Эндру Уэйкфілда, які даказваў, што вакцынацыя выклікае дзіцячы аўтызм. Але потым аказалася, што ўсё не так — гэта была не толькі падмена паняццяў, але і фальсіфікацыя навуковай працы. Нягледзячы на тое, што было надрукавана абвяржэнне, антыпрышчэпкавая хваля пайшла. І дагэтуль «даследаванне» з'яўляецца крыніцай ведаў для антыпрышчэпачнікаў.

Трэба разумець, што інвалідызацыя ад прышчэпак сапраўды можа быць, але толькі ў адным выпадку. Гэта не звязана з самой вакцынай ці агентам, які ўводзіцца. Праблемы могуць узнікнуць, калі парушаюцца правілы выкарыстання прэпарата, напрыклад перавышаецца дазіроўка. Уявім сітуацыю, непадрыхтаваная медсястра бярэцца за вакцынацыю і блытае колькасць прэпарата, які ўводзіць. Сама ж прышчэпка, пры ўмове што вакцына ўведзена правільна і ў чалавека няма алергіі, на арганізм ніякага негатыўнага ўплыву не акажа і спадарожных хвароб не выкліча.

Міф 2. Прышчэпкі змяшчаюць усю табліцу Мендзялеева

Многія ўпэўнены, што ў якасці дадатковых кампанентаў у вакцыны дадаюць самыя разнастайныя рэчывы, у тым ліку такія смяротна небяспечныя, як ртуць, фармальдэгід і інш. Але пры гэтым праціўнікі прышчэпак забываюць, што размова ідзе пра мяжу дапушчальных нормаў. Так, кожная вакцына можа змяшчаць розныя рэчывы. Але ў дозах, дапушчальных для прымянення ў жывым арганізме. Ртуць ёсць нават у звычайнай вадзе, але яе ніхто не баіцца і не задумваецца пра яе.

Міф 3. Лепш перахварэць і выпрацаваць натуральны імунітэт

Гэта не самае лепшае выйсце. Бо дастаткова адзін раз сур'ёзна захварэць, каб атрымаць вельмі цяжкія ўскладненні. Многія з тых паталогій, што лічацца дзіцячымі і прафілактуюцца прышчэпкамі, на самай справе цяжкія і смяротна небяспечныя. Акрамя таго, варта разумець, што вакцынацыя робіцца не для таго, каб на 100 % абараніць ад хваробы, а для таго, каб не атрымаць сур'ёзных ускладненняў ад яе.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Міф 4. У нас няма смяротна небяспечных хвароб

У нашай краіне сапраўды сёння няма такіх смяротных інфекцый, як дыфтэрыя ці поліяміеліт. Але гэта звязана выключна з тым, што раней практычна ўсе прышчапляліся. І зараз мы назіраем, як з-за адмовы ад прышчэпак смяротна небяспечныя паталогіі, напрыклад адзёр, пачынаюць вяртацца.

Міф 5. Вакцынацыя — змова фармкампаній з мэтай атрымання выгады

Усе вакцыны, якія ёсць у Нацыянальным календары прышчэпак, апынуліся там па выніках вялікай колькасці даследаванняў, падчас якіх праводзілі вакцынацыю і рэвакцынацыю, а таксама на працягу некалькіх гадоў і нават дзесяцігоддзяў вывучалі цітр антыцел у крыві. Менавіта па колькасці гэтага цітру і вызначаецца неабходнасць паўторнай вакцынацыі і працягласць абароны арганізма ад інфекцыі. Самі ж фармкампаніі павінны даказаць бяспечнасць і эфектыўнасць сваіх прэпаратаў — і на гэта яны выдаткоўваюць вялізныя сродкі.

Памятайце, што і прышчэпка — не панацэя. І нават прышчэпленаму дзіцяці неабходны фізкультура і загартоўванне

Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

НЕСУПЫННАСЦЬ УСЕАБДЫМНАСЦІ

Супрацоўніца Выдавецкага дома «Звязда» паэтэса Юлія АЛЕЙЧАНКА — сярод лаўрэатаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі

Расцём. Нацыянальная літаратурная прэмія — ужо традыцыя: чацвёрты раз называюцца імёны аўтараў, чые творы звярнулі на сябе ўвагу ў мінулым годзе. І як любую з'яву, што стала традыцыяй, яе пераасэнсоўваюць, не абыходзіцца без наватарскіх ідэй — уласна, дзеля развіцця. Бо добрыя традыцыі павінны захоўвацца. Прэмія ў галіне літаратуры, якая ўручаецца на дзяржаўным узроўні, — традыцыя добрая ўжо таму, што ў розных гарадах Беларусі, па якіх вандруе Дзень беларускага пісьменства, гучаць з галоўнай сцэны імёны найлепшых аўтараў, а да іх твораў узнікае зацікаўленасць: што там адзначылі? Чаму? Сярод каго выбіралі?

Апошняе пытанне, здаецца, пазначае не менш цікавую інтрыгу. Па-першае, сам факт таго, што ў нас ёсць сярод каго выбіраць, дазваляе адзначаць найлепшае на сённяшні дзень у розных плынях прыгожага пісьменства і дае дадатковы стымул для аўтараў. Але ці не больш важнае тут іншае: чытач чуе імёны і творы, што прэтэндавалі на прэмію, можа потым звярнуцца як да тых кніг, што перамаглі, так і да тых, што называліся ў намінацыях падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджвання. Вось яны, папулярызацыя ў дзеянні і значэнне прэміі, якая, акрамя задачы па падтрымцы літаратуры (і пісьменнікаў), выконвае яшчэ адну дзяржаўную задачу — злучаць творы з чытачамі. Таму істотны яшчэ адзін момант: на Нацыянальную літаратурную прэмію маюць права прэтэндаваць усе паэты і празаікі незалежна ад іх прыналежнасці да пісьменніцкіх арганізацый. Заяўкі могуць падаваць як фізічныя асобы, так і арганізацыі. І гэта сведчыць пра адкрытасць прэміі і пра жаданне аб'ектыўна (і ўсебакова) адлюстроўваць літаратурны працэс на сучасным этапе.

Змены ўжо пачалі рабіць сваю справу: сёлета адбыўся літаральна прарыў, найперш у колькасці пададзеных заявак. На разгляд экспертнай камісіі было пададзена каля 60 кніг. У фінал на разгляд журы прайшла 51 кніга. Так, гэта сведчыць пра цікавасць пісьменнікаў да прэміі, якая сёлета стала больш важкай — павялічыўся яе грашовы памер. Запыт ёсць (калі меркаваць па жаданні ўдасканальваць працэдуру вылучэння на прэмію). Ёсць нават прыгожая (і важкая) статуэтка, якую павезлі з сабой з Іванава пераможцы.

Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ адзначыў:

— Урад нашай краіны некалькі гадоў таму заснаваў Нацыянальную літаратурную прэмію. Сёння на сцэне найлепшыя з найлепшых. Віншуючы літаратараў, хачу пажадаць усім: чытайце тое найлепшае, што ёсць у беларускай літаратуры.

Слушная парада! Істотна і тое, што прагучала яна перад вялікай аўдыторыяй свята. А далей былі названыя пераможцы. Адразу. Інтрыга сёлета не зусім атрымалася, пры тым што любая прэмія — гэта спаборніцтва, за якім павінны сачыць, павінны спрачацца па кандыдатурах прэтэндэнтаў і да апошняга моманту чакаць, чакаць, калі назавуць найлепшых у намінацыях сярод іншых вартых увагі. Так, свайго роду гульня, хутчэй рэкламны ход (які мог бы спрацаваць для большай колькасці кніг, што ў нашых умовах істотна). Але ці не падстава гэта для далейшага ўдасканалення працэдуры ўручэння прэміі? Мы ж не так даўно пачалі.

Відаць, з-за таго, што сёлета ў фінале разглядалася надта вялікая колькасць кніг, пакінуць і назваць некалькі імёнаў, што спаборнічаюць у канкрэтных намінацыях, было не так проста. Але найлепшыя, па вызначэнні журы, кнігі нам прадставілі.

Што чытала (чытае, будзе чытаць, павінна пачытаць) Беларусь, каб паглядзець на сябе, сучасную, збоку?

Паводле **Васіля ШЫРКО**, шаноўнага пісьменніка з багатым жыццёвым досведам, **аўтара кнігі аповесцяў «Нязваны госць»**, мы ўсё яшчэ ўглядаемся ў мінулае, без якога не бывае не толькі народа, але і нават асобнай сям'і ці чалавека. Мы можам жыць сярод іншых народаў і імкнуцца спазнаць адметнасць экзатычных краін, але, як ні круці, мінулым прывязаныя да сваіх мясцін, адкуль цягнуцца галінкі ў будучыню. Кніга, выдадзеная ў «Мастацкай літаратуры» (Мінск), адзначана як **«Найлепшы твор прозы».**

Фота БелТА.

Юлія АЛЕЙЧАНКА.

Лёс чалавека праз лёс радзімы дае падставу для разваг паэтам. **Казімір Камейша і яго зборнік вершаў «Высокі бераг»** (выдавецтва «Каўчэг», Мінск). Тут сышлося ўсё: рэчаіснасць і жыццё паэта, тэма сувязі з малой радзімай (вёскай), з якой пачынаецца краіна, боль і філасофскія развагі пра жыццё землякоў. Як у Год малой радзімы абысці ўвагай такую кнігу? Перамога ў намінацыі **«Найлепшы твор (зборнік твораў) паэзіі».**

Гэтая блізкасць і цеплыня ў адносінах да таго, што ёсць радзіма ў асобах, характэрныя кнізе **Зінаіды Дудзюк «Пара высокага сонца»** (выдавецтва «Альтэрнатыва», г. Брэст), якую назвалі найлепшай **у намінацыі «Публіцыстыка».** Кніга нарысаў, успамінаў, эсэ расказвае пра землякоў аўтаркі, тых асоб, якія яшчэ нядаўна вызначалі літаратурны асяродак Брэсцкай вобласці. Але асабліва хочацца адзначыць эсэ «Мова», у якім пісьменніца разважае: «...Існаванне і выжыванне мовы залежыць не ад таго, якая колькасць насельніцтва ёю карыстаецца, а ад паўнаты яе функцый». Адметнасць гэтых разваг узмацняецца згадкай пра адметнасці дыялектаў (якраз на Палессі гэта выдатна адчуваюць) і пра тое, што высокі (літаратурны) узор мовы замацоўвае наяўнасць і спеласць нацыі.

Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі Зінаіда ДУДЗЮК тлумачыць:

— Гэтая кніга для мяне невыпадковая. Я яе выдавала да юбілею Уладзіміра Калесніка. Адчула, што проста прыйшоў час напісаць успаміны пра тых, каго я ведала, любіла, чыёй творчасцю захапляла. Напрыклад, з Нінай Мацяш мы былі знаёмыя ўсё жыццё, з Яўгеніяй Янішчыц ліставаліся. Для мяне вельмі сімвалічнае, але ўсё ж супадзенне, што кнігу ўспамінаў пра творцаў, маіх землякоў, адзначылі падчас Дня пісьменства на Брэстчыне.

А між іншым, магчыма, гэта сведчанне існавання талентаў, якія вырастаюць у гарадах і мястэчках, што сёння мы называем «малой радзімай»? Але ж сапраўды падчас свята Дня беларускага пісьменства ў Іванаве ад думак пра супадзенні (ці, можа, прыцягненні радзімы) цяжка было пазбавіцца.

Яшчэ адзін ураджэнец Брэсцкай вобласці (Давыд-Гарадка) — пісьменнік **Георгій МАРЧУК**. Таксама трыумфатар і цяпер лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі **«Найлепшы твор драматургіі»** за **зборнік п'ес «Святло вышыні».** Цяжка было абысці ўвагай гэтую кнігу пасля завяршэння 2017 года, які прайшоў пад знакам юбілею беларускага кнігадрукавання. Гістарычны кірунак у драматургіі Георгія Марчука, яго зварот да асоб мінуўшчыны зрабілі сваю справу: сярод іншых герояў яго п'ес на авансцэну выйшаў Францыск (альбо Георгій) Скарына.

А мінулае беларускай літаратуры наогул — гэта тэма даследаванняў яшчэ аднаго цікаўнага выхадца з Брэсцкага Палесся. Століншчына — малая радзіма літаратуразнаўцы, прафесара **Івана Штэйнера,** якога адзначылі ў намінацыі **«Найлепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства» за кнігу «Смехъ зъ болѣстию смешанъ будзець: смехавыя традыции Рэнесансу ў сатырычнай літаратуры XX стагоддзя».** Іван Штэйнер умее сур'ёзныя тэмы прадстаўляць праз даследаванні, скіраваныя на папулярызацыю літаратуры, і лічыць:

— Літаратуразнаўства можа быць такім сур'ёзным, што чытаць яго могуць толькі спецыялісты, але я імкнуся рабіць яго зразумелым для большага кола зацікаўленых. Акрамя задачы папулярызацыі беларускай літаратуры, для мяне істотна, каб мы адыходзілі ад сваёй не то сціпласці, не то закамплексаванасці: няхай спачатку іншыя людзі нам скажуць, што гэта варта ўвагі, і тады мы скажам «добра». На жаль, нашы людзі (у шырокім сэнсе) не вельмі ўсведамляюць, якія скарбы ёсць у нашай літаратуры. Сёння, згадваючы Напалеона Орду, казалі, што ён быў знаёмы і са Стэндалем, і з Бальзакам, Расіні ведаў, а таму, што быў выхаваны ў цэнтры еўрапейскай культуры. І мы, таксама як і любая літаратура, якая ўзнікае, пачынае развівацца ў сілавым полі сусветнай літаратуры. Трэба ж ад нечага адштурхоўвацца. Беларускую літаратуру ў XIX стагоддзі стварала шляхта, яна мела адукацыю, яе прадстаўнікі ведалі некалькі моў і знаёміліся з еўрапейскай літаратурай свайго часу. Я хацеў асэнсаваць некаторыя паасобныя з'явы літаратуры XX стагоддзя праз прызму старадаўніх уяўленняў і разбурыць некаторыя стэрэатыпы. Напрыклад, што ў нас носьбітамі смеху былі беларускія сяляне. Шмат апавяданняў і казак пра кемлівага селяніна, які падманвае то папа, то пана і трапляе ў розныя смешныя сітуацыі. А насамрэч беларуская смехавая культура — розная, яна і кніжная, і літаратурная, я паказваю, што ў аснове еўрапейскай смехавой культуры была «Пахвала глупству» Эразма Ратэрдамскага. Ён паказаў, што чалавек не можа быць шчаслівым да канца. Хацеў паказаць еўрапейскі кантэкст у нашай літаратуры. Нам шмат у чым трэба пазбавіцца ад комплексу правінцыйнасці. Гэта тое, што важна для мяне: паказаць, што падобныя з'явы адбываліся ў чэшскай ці, напрыклад, украінскай літаратуры. Таму што нічога не з'яўляецца на пустым полі. Напрыклад, як магла б з'явіцца Святлана Алексіевіч, калі б не было кнігі «Я з вогненнай вёскі» і Алеся Адамовіча, які казаў, што літаратура дайшла да тупіка і не можа абуджаць чалавека, таму трэба ствараць звышлітаратуру. Што такое звышлітаратура, ён не сказаў, але жыццё вымусіць шукаць нейкую форму. І мы ідзём у многім напарадзе, але часта баімся пра гэта казаць. Пра тое, што «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» Караткевіча — першы постмадэрнісцкі раман і варта было б яго раскруціць належным чынам. На мой погляд, трэба пачынаць са школы, выбіраючы іншы падыход да размовы пра літаратуру.

Праўда, сёння пераважна мы ўсё ж больш заклапочаны тым, каб дзеці наогул прывучыліся да кніг, зразумелі, што чытанне — прыемны занятак. Гэтым займаецца і **Вольга МІКОЛЬСКАЯ**, што здабыла перамогу ў намінацыі **«Найлепшы твор для дзяцей і юнацтва» за кнігу «Выкраданне шэдэўра, ці Новыя прыгоды агентаў «Калбафіржык».**

А далей — новы клопат. Пра тое, каб не кінулі чытаць тыя, хто з дзяцінства рос з кнігай. І гэта ці не адна з праблем нашага часу: малады чытач, які не шукае (ці не знаходзіць?) кнігі для сябе. А яны ёсць. І іх ствараюць маладыя аўтары, якія адчуваюць, перажываюць, выказваюць свае хваляванні і думкі пра сённяшні свет. Маладая паэтэса **Юлія АЛЕЙЧАНКА** ўпэўнена, што творчасць і ў наш электронны час не застаецца без увагі, яна набывае новыя пляцоўкі, праз якія прыходзіць да чытача. Але прыходзіць усё ж у выглядзе кнігі: **зборнік паэтак «Пад чароўным шкельцам»** (Выдавецкі дом «Звязда») перамог **у намінацыі «Найлепшы дэбют».** Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Юлія Алейчанка лічыць:

— Я адчуваю ўвагу сярод моладзі да кніг, таму што зараз ідзе актыўнае абмеркаванне літаратурнага жыцця і ў сацыяльных сетках, і на розных адмысловых сайтах. Цешыць, што гэта абмеркаванне менавіта маладой беларускай літаратуры, нават у «Фэйсбуку», які іранічна называюць «галоўнай літаратурнай пляцоўкай краіны», таму што там ёсць розныя супольнасці і ёсць жывая рэакцыя. Для аўтара важнае як непасрэдна жывое прызнанне, так і атрыманне сур'ёзнай літаратурнай узнагароды, таму што яна дае і падтрымку, і з'яўляецца стымулам для развіцця.

І магчыма, грашовую частку сваёй прэміі супрацоўніца часопіса «Полымя» Выдавецкага дома «Звязда» скарыстае для стварэння наступнага зборніка... Бо літаратурны працэс не павінен спыняцца.

Сустаршыня журы прафесар Іван САВЕРЧАНКА адзначыў:

— Нашы сённяшнія пераможцы — шчырыя працаўнікі на ніве літаратуры, на ніве мастацкага слова. Яны выдатна ўсведамляюць: калі не будзе адукаванасці, значыць, будзе неадукаванасць. Калі не будзе культуры, значыць, будзе безкультурнасць. Калі не будзе святла, то будзе цемра. Яны шчыра працуюць, каб была адукаванасць, культура, святло на нашай зямлі. Літаратура ўсеабдымная і ўсепранікальная. Без добрага рамана немагчымы цудоўны кінафільм, без п'есы немагчымы спектакль. Без мілагучных вершаў немагчымыя спевы. Кожны з пісьменнікаў адчувае сваю адказнасць перад краінай, перад народам і шчыра працуе дзеля гэтага. Разам з тым мы адчуваем, што кіраўніцтва дзяржавы падтрымлівае творцаў: ёсць шмат праграм, дзякуючы якім забяспечваецца высокі ўзровень духоўнай культуры ў нашым грамадстве. Міністэрствы інфармацыі, культуры і адукацыі працуюць над тым, каб мастацкае слова пашыралася, каб выхоўваліся эстэтычныя густы грамадзян у краіне.

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Жыццёвінкі

Не толькі асабістае

ПАМЫЛІЛІСЯ

Было гэта даўно, яшчэ ў так званы савецкі час. Тады можна было сесці ў самалёт і за некалькі гадзін апынуцца ў Ташкенце. Ніякіх табе перашкод — ні мытняў, ні віз. Што і зрабілі Валянціна Трафімаўна і Юрый Адамавіч, жыхары беларускай вёскі, мае землякі. Працавалі яны ў калгасе: жанчына ў паляводчай брыгадзе, мужчына — у будаўнічай. Паляцела з імі і старэйшая дачка Тоня. А прычына апынуцца ў сталіцы сонечнага Узбекістана мелася важная: браўся шлюбам іх сын і брат Сашка, які пасля заканчэння Магілёўскага машынабудаўнічага тэхнікума атрымаў накіраванне ў Ташкент на мясакамбінат: там выпускнікі аддзялення халадзільна-кампрэсарных механізмаў былі запатрабаваны як нідзе. Ну і пакахаў беларускі хлапчына там мясцовую дзяўчыну, бацькі якой таксама прыехалі некалі сюды па размеркаванні з Расіі і засталіся на ўсё жыццё. А чаму не?! Горад прыгожы, круглы год садавіна і агародніна. Ды і з кар'ерай у галавы сям'і ўсё складвалася лепш не прыдумаеш — запрасілі пазней нават у міністэрства сельскай гаспадаркі начальнікам аддзела.

Як там праходзіла вяселле, Валянціна Трафімаўна не дужа ахвотна расказвала землякам, магла рукой махнуць і вымавіць адчайна: «Ат!» Тыя асабліва і не надакучалі: не хочаш расказваць — і не трэба, бяды тае. Жылі без тваіх аповедаў, не памерлі, пражывём і далей.

І ўсё ж неяк жанчына, а на той час яна стала старэнькай бабулькай, з сумам у голасе сказала мне, калі я наведаў яе ў Ташкент ездзіла, а то памру і з сабой панясу тайну. Юрка, пухам зямля яму, ужо не раскажа, а Тонька далёка жыве. Пра само вяселле нічога не скажу дрэннага. І людзей было шмат, і музыка грала. За горадам рабілі. Сярод дрэў, бо ў горадзе ўлетку там дыхнуць няма чым. Ой, Сашка, як ён церпіць? Спякота, духацішча! Жах! Праўда, ён мне сказаў, ілгаць не буду: а мне, маці, такі клімат падабаецца. Ну падабаецца, то і жыві сабе. Дык вось, суседзе, далі нам сваты падарункі. Яны загорнутыя былі ў паперу. А ранкам разгарнулі тыя пакункі, на цвярозую галаву глянулі — я і абамлела: божа, уся адзежа паношаная, ці ж мы не бачым! І я адразу ўспомніла сваю вёску, уявіла людзей, якія прыбягуць і адразу ж папытаюць: ну дык паказвай, Трафімаўна, што там табе сваты падарылі! Яны ж багатыя людзі, то, відаць, ашчаслівілі! А што я магла ім паказаць — гэтыя транты паношаныя? Дзень праплакала. За каго ж яны нас прынялі? Думаюць, цяпер у вёсках беларускіх людзі так жывуць, як і раней? Ды не, далёка шагнула вёска, адсталі вы, гарадскія. Ай! Тут мой гаспадар кажа: вытры слёзы, маці, грошы маюцца, дык што хочаш, што глянецца табе, тое і купім. Бяды тае! Ну, дзе тут тыя крамы? Паказвайце!

Так і зрабілі. А падарункі сватоў не выкінулі: прывезлі з сабой, так і ляжаць у шкапчыку. Не спатрэбіліся. Людзям жа пахвалілася тымі падарункамі, што самі набылі. Ім спадабаліся, нават сватоў пахвалілі: бач ты іх, не жмінды якія-небудзь. А Сашка, слава табе, госпадзі, добра жыве. Яму мы пра той казус не сказалі, а то яшчэ вып'е калі і ляпне. І добра зрабілі... Ай, ды што ўжо цяпер успамінаць! Даўно было. Яны гарадскія, і праўда ж думалі, што мы, сяляне, бедна жывём, галота... Бач, як памыліліся!.. Хоць і вывучаныя!..

ВЯТРАК

На самай поўначы Гомельскай вобласці ёсць прыгожая вёска Хатоўня. Далей, калі рухацца па некалі шырокай і дагледжанай гравійцы, амаль адразу ж пачынаецца Магілёўшчына, і першы населены пункт тут — вёска Іскань, таксама не менш прыгожая. Мае бацькі дажывалі свой зямны век у Іскані, і таму я, гамяльчанін, ехаў на рэйсавым аўтобусе (тады яны хадзілі рэгулярна, бо свайго транспарту ў людзей амаль што не было), а далей дабіраўся звычайна пехам. Але, паверце мне, больш лёгкай дарогі, як дарога да бацькоўскай хаты, не існуе ў свеце. Ногі самі неслі. Да мамы. Да таты. Да малодшых братоў... Назад ішлося намнога цяжэй у прамым і пераносным сэнсе: маці, як ты ні ўпарціся, напакуе табе торбачак і вялізак, — як данесці? Даносіў, вядома ж. Але на працягу амаль усёй дарогі, а гэта добрыя чатыры кіламетры, баяўся спазніцца на аўтобус. І яшчэ — каб ён не зламаўся. Бо заўтра ж на працу, а адсюль, з Хатоўні, ніяк больш да Гомеля не даедзеш. Тупік. Але ўсё неяк абыходзілася, і ў мяне быў яшчэ час пасядзець пад ветраком — старэнькім, незапатрабаваным на той час, таму з вялікім свірнавым замком на дзвярах. Каля яго быў канцавы прыпынак аўтобуса. Я помніў той вятрак яшчэ з часу, калі ён працаваў, і тады, праходзячы каля яго, звычайна спыняўся, задзіраў галаву на крылы-гмахі, і ў мяне, мусіць жа, галава кружылася, і як не падала з яе шапка: вось дык дзіва дзіўнае!

Прайшло шмат гадоў. Перастаў хадзіць аўтобус у Хатоўню — няма, кажуць, пасажыраў. Пагаджуся: амаль у кожнай сям'і цяпер свой легкавік. Адвязуць — прывязуць — сустрэнуць. І мне ў Іскань (цяпер толькі на могілкі, каб праведаць бацькоў, родных і блізкіх людзей) зручней дабірацца іншай дарогай — па асфальце. Але неяк я заглянуў у Хатоўню наўмысна, бо якраз у той час рыхтаваўся пісаць аповесць «Вятрак — птушка вольная», таму хацеў на свае вочы яшчэ раз убачыць млын, каб больш грунтоўна разгледзіць яго. Спадзяваўся пабываць і ўнутры. Аднак на месцы ветрака — на маё глыбокае расчараванне — убачыў пустку. Вось табе і маеш!

Сёння многія хатаўляне шкадуюць: навошта разбурылі вятрак, каму ён перашкаджаў? Кажуць, баяліся, каб сам не ўпаў ды не прыціснуў каго выпадкова. Ну і перастрахоўшчыкі мы! Ды каб паваліць той вятрак, спатрэбіліся ажно тры трактары ў адной счэпцы! Уяўляеце? І тое ён ім не адразу паддаўся.

І яшчэ кажуць хатаўляне: сёння, калі ў нас развіваецца экатурызм, вятрак быў бы самым каштоўным экспанатам ва ўсім раёне. Калі шырэй не ўзяць. А стаў... помнікам людскога бяспамяцтва.

Аповесць усё ж я напісаў. І нядаўна вучні з маёй малой радзімы падарылі мне макет ветрака. Самі зрабілі. Аднак, скажу вам, ён вельмі падобны на той вятрак, які я бачыў, а яны, вучні, на вялікі жаль, не. І ўжо ніколі не ўбачаць. Шкада. Вельмі.

ЛАЗАРАВІЧ

Барыс Лазаравіч Кавалерчык — чалавек у літаратурным асяродку вядомы. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Яго ведаюць не толькі ў нашай краіне як аўтара афарызмаў. Выдаў дзве кнігі. Піша таксама гумарэскі, іранічныя вершы. Дарэчы, ён майстар спорту па шашках. І да ўсяго гэтага — вельмі памяркоўны, разважлівы, добразычлівы чалавек. Пра такіх кажуць: мухі не пакрыўдзіць.

З Лазаравічам мы сябруем, таму нярэдка тэлефануем адзін аднаму, дзелімся літаратурнымі планамі, задумкамі, абмяркоўваем прачытаныя творы сваіх калег. Вядома, пагамонім і пра здароўе. Але вельмі асцярожна. Калі чалавеку за восемдзесят, то, як спяваецца ў вядомай песні, не трэба сыпаць соль на рану. Хвароб, канешне ж, хапае, не без таго. Таму, заканчваючы размову, я кожны раз жадаю Лазаравічу не хварэць. Ён жа ўздыхне, вытрымае паўзу, але скажа бадзёра: «Тваімі б малітвамі... Але буду старацца. Дзякуй».

Учора Лазаравіч паскардзіўся, што ягоныя афарызмы не хочуць друкаваць у адным вядомым нашым часопісе. Пры гэтым засведчыў, што ў паважанай маскоўскай «Литературной газете» друкуецца амаль што ў кожным нумары. Чаму так? Дзе справядлівасць? Паразважалі і пра гэта. Я пастараўся супакоіць Лазаравіча: маўляў, гэта ж выдатна, што «Літаратурка» друкуе (яна, дарэчы, назвала ў свой час майго старэйшага калегу майстрам афарызмаў), бо яе чытаюць у тых жа Злучаных Штатах Амерыкі, у Ізраілі, дзе жывуць многія сябры і сваякі Лазаравіча. Пагадзіўся ён і з тым, што калі б яго афарызмы надрукавалі ў нашым беларускім часопісе, то, вядома, часопіс таксама чыталі б у тых краінах, дзе чытаюць «Літаратурку». «Канешне, чыталі б, — пагадзіўся Лазаравіч. — Я абавязкова даслаў бы па адным экзэмпляры сваім сябрам...» Пасмяяліся, пажадалі адзін аднаму добрай ночы і развіталіся.

Назаўтра я ехаў у Бабруйск на фестываль беларускай драматургіі. Ажно на тыдзень. Пахваліўся, вядома ж, і Лазаравічу. Ён змоўчаў. А крыху пазней, калі размова зайшла зусім пра нешта іншае, вярнуўся да маёй паездкі на фестываль.

— Ты б, — сказаў, — і жонку ўзяў з сабой. Хай бы і яна развеялася. Ёй, ведаю, таксама было б прыемна...

Эх, Лазаравіч, добрая ты душа! Я зразумеў яго, як, можа, ніхто іншы: гадоў колькі назад ён страціў жонку і надта цяжка прывыкае да адзіноты. Калі наогул зможа ён да яе прывыкнуць...

КРЫЎДА

У нядзелю да Сіваковых прыехалі старэйшы сын Толік і ўнук Максім, бо нешта забарахліў дзядулеў камп'ютар. Трэба выручаць старога, таму што сёння ён без яго не ўяўляе жыцця. Калі раней бавіў час на двары, дзе збіраліся мужчыны, каб пагуляць у даміно і пра жыццё пагаманіць, то цяпер дзеда зусім не выгнаць з кватэры — прыкіпеў, адным словам, да кампа. А бабуля дык і радуецца: «Лепш хай дома сядзіць — тут спакусы менш». Бабуля ёсць бабуля. Яна і цяпер круціцца каля сына і ўнука, стараецца тым нават нешта падказаць.

— Паспрабуй, Максім, вось гэты шнур пакратаць: можа, перацёрся? — раіць, скрыжаваўшы рукі на жываце.

Максім моршчыцца:

— Ну бабуля! Не перашкаджай...

— Глянь, глянь! — не адступае тая. — Працэсар быццам жа новы. Не павінна быць, каб ён закапрызіў. А?

Хлопцы моўчкі робяць сваю справу і стараюцца не рэагаваць на недарэчныя — толькі не з погляду бабулі, канешне, — падказкі. Дзед, як заўсёды, маўчыць, бо ён сваю старую добра ведае, яе лепш не чапаць, — і спакойна-сканцэнтравана назірае за сынам і ўнукам: можа, калі і самому спатрэбіцца гэтая навука? Аднак усё ж сумняваецца, што запомніць нешта, бо і так дзівяцца суседзі, што ён у такім паважным узросце карыстаецца камп'ютарам: нешта піша, нешта чытае там... Малайчына!

Не вытрымлівае бабуля, заглядвае туды, дзе корпаюцца майстры, з дзелавым выглядам:

— Ну што, зрухі ёсць?

Сын Толік таксама моршчыцца, як некалі Максім:

— Мам! Ідзі на кухню! Гатуй абед!

Старая глядзіць на дзеда, з непрыхаваным папрокам у голасе заўважае:

— Бачылі? Я ім ужо і не патрэбна!

І, пакрыўджаная, пакідае майстроў...

Васіль ТКАЧОЎ

■

■ Zамор'е

Хлопец зрабіў прапанову каханай з дапамогай каровы

Фермер з Шатландыі зрабіў сваёй дзяўчыне прапанову рукі і сэрца, напісаўшы маркерам фразу «Ты выйдзеш за мяне?» на адной са сваіх кароў.



Спачатку сяброўка фермера заўважыла, што на баку жывёлы нешта напісана, але не змагла прачытаць, паколькі карова ў гэты момант павярнулася іншым бокам. Калі жывёла падышла бліжэй да пары і дзяўчына ўбачыла напісанае пытанне, яе каханы ўжо стаяў перад ёй на каленях з пярсцёнкам. Па словах жаніха, карова па мянушцы Кучараўка больш за ўсіх падабаецца яго выбранніцы.

Дзяўчына адказала згодай свайму маладому чалавеку. Пазней яна апублікавала ў сацыяльных сетках фатаграфію каровы з надпісам на баку. Фермер адзначыў, што накіруе запрашэнне на вяселле і Кучараўцы, аднак не ўпэўнены, што яна гатовая яго прыняць.

Ашуканцы выдалі дзяўчыну замуж падманам

А вось жыхарка Ганконга, у адрозненне ад шатландскай дзяўчыны, апынулася замужам за незнаёмым мужчынам з КНР, зусім не жадаючы гэтага, паведамляе выданне South China Morning Post.

21-гадовая дзяўчына звярнула ўвагу на аб'яву, якая абяцала нядрэнную зарплату і не патрабавала вопыту работы. Калі яна звярнулася на пазначаны адрас, яе ўгаварылі запісацца на бясплатныя курсы арганізатараў вяселляў. Падчас выпускнога экзамену пасля заканчэння курсаў, які праходзіў у кітайскім горадзе Фучжоу, дзяўчыне прыйшлося гуляць ролю нявесты і распісацца з нейкім мужчынам, які іграў жаніха. Арганізатары курсаў запэўнівалі яе, што пасля экзамену шлюб анулююць. Вярнуўшыся ў Ганконг, яна даведалася, што гэтага не адбылося.

Дзяўчына мяркуе, што стала ахвярай махляроў, якія падманам выдалі яе замуж за незнаёмца. За справу ўзяліся юрысты Федэрацыі прафсаюзаў Ганконга, дзе мяркуюць, што пацярпелі і іншыя жанчыны. Хутчэй за ўсё, некаторыя з іх нават не здагадваюцца, што заключылі афіцыйны шлюб. Махляроў маглі цікавіць дазволы на пражыванне ў Ганконгу, якія выдаюцца грамадзянам КНР у тым выпадку, калі іх муж або жонка жывуць у гэтым горадзе.

Жанчына выратавала жыццё кавалеру на першым спатканні

Паводле інфармацыі The Mirror, у яго здарыўся сардэчны прыступ.

Амерыканскі анестэзіёлаг Эндзі Трэйнар расказала, як на першым спатканні была вымушаная зрабіць масаж сэрца і штучнае дыханне свайму кавалеру. Інцыдэнт адбыўся ў горадзе Санта-Круз у Каліфорніі. 45-гадовую Трэйнар запрасіў на спатканне яе 56-гадовы знаёмы Макс Мантгомеры, які прызнаўся ёй у сімпатыі. Пара адправілася на пляж, дзе яны каталіся на надзіманых дошках. Калі мужчына выйшаў з вады, ён нечакана страціў прытомнасць і ўпаў. Трэйнар паспрабавала прамацаць яго пульс, але яго не было, і яна пачала сардэчна-лёгачную рэанімацыю. Сведкі здарэння выклікалі «хуткую». На наступны дзень Максу зрабілі каранарнае шунціраванне.

Прадавец ляпіў рыбам вочы

У Кувейце закрылі рыбны магазін за махлярства. Як паведамляе Твітэр-акаўнт выдання Al Bayan, прадавец прыляпляў пластыкавыя вочы на рыб, каб яны здаваліся свежымі.

Па звестках выдання Al Arabiya, падман выявіўся, калі пакупніца пачала мыць рыбу і прылепленае вока адвалілася. Яна падзялілася здымкамі ў сацыяльных сетках, дзе яны здабылі вірусную папулярнасць. На іх звярнула ўвагу і міністэрства гандлю, яго прадстаўнікі звязаліся з жанчынай, а затым закрылі рыбны магазін. Як паведамляецца, прадавец ведаў, што пакупнікі вызначаюць свежасць рыбы па колеры вачэй, і хаваў пажоўклую вясёлкавую абалонку пад налепкай.

Карыстальнікі «Твітэра» з усяго свету пасмяяліся з няўдачлівага прадаўца і назвалі метад непераканаўчым.

Іван КУПАРВАС

■

«Мужчыны ў нас — на пералік, Вось і шануем іх без меры...»

Што было, — было: дом, вечар, тэлефонны званок, мужчынская размова:
— Алё, суседзе, прабач, што так позна... Нешта маёй жонкі дагэтуль няма... Да цябе выпадкам не заходзіла?
— Пачакай — зараз папытаюся... Люся, ты да мяне выпадкова зайшла ці спецыяльна?
Вам цікава: што адказала Люся — яму?
А што потым сусед суседу?
Хацелася б ведаць, праўда? Аднак варыянтаў, мяркуем, няшмат.

Іншая рэч — традыцыйны, звяздоўскі здымак (можна яшчэ раз глянуць на верхні)! Чаго толькі людзі на ім не ўбачылі, чаго не прыдумалі ды не ўспомнілі! Ну вось напрыклад. «Ехаў я неяк маршруткай, — прыгадвае **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў,** — сядзеў тварам да салона, амаль побач з шафёрам, а перада мной — маладзічка размясцілася, і спадніца ў яе дзе пачалася, там і скончылася: мусіць, тканіны не хапіла, бо ногі — доўгія-доўгія, «ад вуха» можна сказаць. Спачатку яны роўненька так стаялі — адна пры адной, потым правая на левай ляжала, і я казаў сабе: «Дзед, глядзі ў акно — адвярні галаву. Зараз жа!» Але шыя гэтай каманды быццам «не чула»: вочы проста намёртва прыкіпелі да дзявочых каленяў! І таму, — прызнаецца спадар Валерый, — я лёгка разумею і нават спачуваю хлопцам са здымка. Ну сапраўды:

Не шкадуюць мужыка
Ў гэтай самай ПМК:
То ж пакуты для Мікіткі
Цэлы дзень глядзець на лыткі!
Каб на іх камбінезон,
Ці ж курыў бы столькі ён?»

Наўрад...

Мяркуе так і **спадарыня Любоў Чыгрынава з Мінска:**

Маечка ды шорцікі,
У паглядзе чорцікі...
Расцвіла сягоння Зоя,
Быццам ружа на газоне, —
Ды для ўсіх,
усіх людзей?..
Не дражніла б ты гусей!
Яшчэ Жэню не да фені,
Ясь не еўнух і не гей!

А таму

Ясь, узяўшы рукі ў бокі,
Не рыхтуецца ў скокі —
Чорта шчыльна прыціскае,
Што ў рабро яго штурхае...
А было ж бы болей толку,
Каб на дзеўцы —
ды футболка,
Каб старыя шаравары...
Хлопцы б побач працавалі.

Пытанне на засыпку: а яно ёй трэба (каб працавалі)? На думку многіх чытачоў — не.

Чаму? Ну па-першае (паводле **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды**):

У брыгадзе сёння свята —
На работу выйшла Ната!
Кажа: граблі плюс дыета —
І схуднею я за лета...
Калі ж не — мой лысы чорт
Сам паедзе на курорт.

Сам — трэба разумець — адзін, без Наты? Ды падчас так званага аксамітнага сезона?!

Гэта, згадзіцеся, стрэс! І здымаецца ён вельмі цяжка... Найлепей — на кухні. Не, бронь божа, не выпіваючы нешта з градусамі. І не «заядаючы». Усё прасцей, як раяць бывалыя. Трэба проста: а) купіць індыка, б) назваць яго імем таго самага «чорта» (лысага ці не — справа дзясятая), в) адрэзаць яму ўсё што захочацца і г) асцярожна, памалу апусціць у кіпень.

Жорстка? Так. (Анекдот, дарэчы. Мужчына адзін дакрычаўся да Бога, каб спытаць: ну чаму ўсе дзяўчаты пяшчотныя і мілыя, а ўсе жанчыны — якраз наадварот — проста сцервы? Бог толькі цяжанька ўздыхнуў ды сказаў відавочнае: «Дык дзяўчат жа стварaю я, а жанчынамі іх робіце вы». З усімі адсюль наступствамі...

Зрэшты, мы трохі адхіліліся ад курсу (**спадарыня Іна Алісевіч з Уздзеншчыны** сфармулявала яго так: *«Эмансіпацыя? Эмансіпацыя! Чаму ж адна працуе працыя?»*).

Свой варыянт адказу на гэтае пытанне ў **спадара Валерыя Гаўрыша:**

Майстар загады
аднекуль прымае
(Зранку мабільнік
яго не змаўкае).
І брыгадзір не
гультай-самадур,
Проста ў яго ўвесь час
перакур.
Толькі Ганулька пасады
не мае —
Цэлы дзянёчак
граблямі махае.

«Наш чалавечак!» — лічыць **спадар Мікалай Старых з Гомеля.** Бо яны — нашы (жанчыны ў прыватнасці), славяцца не толькі дабрынёй ды знешняй прывабнасцю, але і рэдкай працавітасцю. Ну сапраўды:

Кажуць людзі: «Пол прыгожы
Да ўсялякай справы гожы:
Мыць, варыць і цыраваць,
Кранам грузы паднімаць...»
А мужчыны —
пол наш дужы —
Працаваць не прагне дужа.
Лепш кім-небудзь кіраваць,
Ці дзяжурыць-вартаваць.

...Таго, хто працуе? Ну чаму б і не (на думку **спадара Міколы Кісяля з Мінска**). Асабліва — калі ведаць, што — канкрэтна — той працаўнік (ці працаўніца) робіць:

Во дзяўчо ахову мае —
Не сказаць, не апісаць!
Ці не золата зграбае,
Каб бюджэт наш папаўняць?

Зрэшты, гэта ў папярэднікаў модна было «раньше думать о Родине, а потом о себе». Потым (на думку **спадара Піваварава**) часы (і адпаведна — норавы) змяніліся:

Дзеўка грошыкі грабе
І вядома ж, пад сябе.
Каб падаткі ўсе сплаціла, —
Сочыць дзядзечка з мабілай.
А высокі самы з іх
Кантралюе... абаіх.

Усё, карацей, па-нашаму і таму **спадарыня Галіна Пятроўская з вёскі Ардашы Смаргонскага раёна** здымак прапануе падпісаць коратка:

Адна баба
Ў двух прарабаў...
Калі з ёй такая «варта»,
Значыць, справа тога варта!

Прычын таму — мільён, можа, нават сто! І наогул (паводле **спадарыні Іны Алісевіч**):

Зласліўца, прыкусі язык,
Найлепшыя ўбач намеры:
Мужчыны ў нас — на пералік,
Вось і шануем іх без меры.
Няхай пакураць, адпачнуць,
Дамовяцца наконт рыбалкі...
А колькі ласкі зберагуць,
Калі ў іх праца не з-пад палкі!

Жанкам жа — наадварот — заўсёды можна і нават трэба (як лічыць **спадар Сабалеўскі**):

Колькі грацыі і спрыту —
Не працуе, а пяе,
За граблямі, як за сітам,
Ні грудочка ў яе!
А пасля газон засее,
Падмяце дарожку чынна,
Нібы ветрыкам павее:
«Мы чакаем вас, мужчыны!»

Чакаем, як правіла, і найбольш, у пэўным узросце — прынцаў... На белых конях.

А вось у іх — пажаданні куды больш сціплыя: ім, прынцам ці няпрынцам, дастаткова служанак

...Зрэшты, у варыянтах подпісаў да здымка не толькі аб узаемаадносінах мужчын і жанчын, — уздымаюцца і іншыя тэмы, накшталт

Былі, былі ў нас пераkуры —
Ды так, хвіліначак на пяць...
А з тэлефонам сёння здуру
І змену можна прастаяць!

Сцвярджае **спадарыня Любоў Чыгрынава.**

От Марусьцы не шанцуе:
Як не курыць, —
хай працуе! —

дадаюць **спадарыня Гудачкова** і **спадар Іван Сіманёнак з Паставаў.**

Ён, у прыватнасці, піша, што навядзенне марафету перад нейкімі святамі ды візітамі ніколі не абходзіцца без прыцягнення выпадковых асоб. Запрашаюць іх з розных кантор, у гэтым выпадку, на думку чытача, няйнакш як са сталічнага ЖЭСа?

Ад «плакучых»
кранаў
Ды «чаявых» як грэху
Прымусам адарвана
Эліт-каманда
з ЖЭСу.
Сантэхнікам
лайдачным
Да лямпы
парк культуры:
Сэр Гінес,
ты не бачыў
Такога перакуру!

Але ж варты здзіўлення не толькі ён. Яшчэ раз кіньце позірк на верхні здымак і згадзіцеся са спадарыняй Валянцінай Гудачковай:

Нейкі клімат дваякі —
У цёплых куртках
мужыкі...
Мы ж да грабель
як дарвёмся —
У міг вока распранёмся!

Пытанне на засыпку: можа, таму ў апошні час павышаным попытам у дзяўчат, у жанчын сталі карыстацца кавалеры-адмарозкі?

Накшталт іх бываюць (на думку **спадарыні Іны Алісевіч**) яшчэ і дзядзькі:

Бездакорна інструктаж
Правялі Сцяпан з Мацвеем
Ды Тамару ўзяў мандраж:
Ледзь трымае граблі, млее...
Бо наслухалася шмат
(Галаве патрэбны лекі).
Быццам граблі... агрэгат
Згодна правілам бяспекі.

...І тым не менш, нягледзячы ні на бязглузды інструктаж, ні на спёку, ні на падвоены кантроль ды многае іншае:

Справу добрую для нас
Сёння робіць зелянгас!
Каб яго, крый бог, прыкрылі,
Спрэс былі б аўтамабілі
І не зналі б нашы дзеткі,
Як цвітуць улетку кветкі.

А таму — парада:

Ты не стой тут, як статуй!
А згінайся і працуй!

То-бок далучайся да работнікаў зелянгаса...

Заклікаюць да гэтага сужэнцы **Астроўскія — жыхары сталіцы,** пра якую **спадарыня Галіна Пятроўская** прыгадала і «перапела» прыпеўку:

Ох і добра ў Мінску жыць:
Адна робіць, два стаіць.
А як сонца прыпячэ,
То й работніца ўцячэ.

Бо яна, магчыма, «штучка» яшчэ тая: ну ў прыватнасці (і на думку **спадарыні Чыгрынавай**):

Мела кабета
Сям'ю і пасаду.
Віно, цыгарэта...
І гэта ўсё ззаду.

Такое, вядома ж, здараецца... І каб толькі:

Каратыстка Міла
хулігана збіла:
За «перавышэнне» —
суткі «зарабіла».
У лесе адбывае.
З гэтае прычыны
Да яе баяцца падысці
мужчыны,—

лічыць **спадарыня Кусянкова з Рагачоўшчыны.**

Завяршыць жа сённяшні агляд хочацца жыццесцвярджальнымі радкамі **спадарыні Валянціны Гудачковай,** якая, здаецца, пераканана:

Ці гародчык тут, ці дача,
Ці шырокія палі...
Ад хвароб і ад нястачы
Лечыць праца на зямлі!

Хто-ніхто — сумняваўся... І сумняваецца. А мужчынка адзін яшчэ і расказваў, як ускопваў ён аднойчы граду, як убачыў раптам рубель, як падняў яго — паклаў у кішэнь, зноў узяўся капаць — зноўку знайшоў рубель! І так — разоў з дзесяць! Ну, думае, на жылу напаў: няйначай нехта рассыпаў — мне на прыбытак. Руку ў кішэнь — а рублі там чамусьці не звіняць... Патрос — ціха. Вонкі вывернуў — дзірачка ўнізе, якраз для рубля...

Аблом, карацей, без якога — зазначым — ну ніяк не абысціся, калі падводзіш вынікі ў якім-небудзь конкурсе.

Такім чынам, найлепшыя подпісы да мінулага здымка (гл. нумар «Звязды» за 14 ліпеня г. г... На ім, нагадаем, быў сумны сабачка каля крамы «Дзіцячае адзенне»), паводле вялікага чытацкага журы, напісалі **спадарыні Наталля Шкут са Светлагоршчыны, Іна Алісевіч з Уздзеншчыны, спадары Мікалай Старых з Гомеля, Іван Сіманёнак з Паставаў, Віктар Сабалеўскі з Узды і сужэнцы Астроўскія з Мінска.**

З гэтым вось, апошнім, меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае, рэдакцыйнае. Такім чынам, прыз у выглядзе квартальнай падпіскі на дарагую сэрцам газету застаецца ў сталіцы, аўтарам радкоў:

У гэтай крамцы, як здаецца,
І сабака прадаецца!
Бо цяпер усё часцей
Іх купляюць для дзяцей...
А яшчэ — замест дзяцей,
Бо з сабакамі прасцей.

...Вы таксама хацелі б пяць разоў на тыдзень *а*трымліваць «Звязду» і тым самым *пад*трымліваць мову — у душы і краіне? Тады не забудзьцеся аформіць падпіску. Альбо — уважліва паглядзіце на ніжні здымак, падумайце, што б гэта значыла (версій можа быць шмат, але ў кожнай — не больш за восем радкоў) і дашліце ў рэдакцыю. А там...

Шанц на перамогу ёсць у кожнага! Поспехаў!

Валянціна ДОЎНАР.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



УСЁ ГЭТА ВІДАЦЬ З ВЫШЫНІ

З вышыні птушынага палёту вёска Ляскавічы (Іванаўскі раён) — зусім невялікае паселішча.

З той жа вышыні перад мясцовай царквой выразна відаць геогліф — пяцідзесяціметровая клумба рознакаляровых кветак, зробленая ў форме крыжа святой Ефрасінні Полацкай.

Калі ўгледзіцеся — заўважыце старанна дагледжаныя і з любоўю ўпрыгожаныя не толькі царкоўны двор, але і панадворкі вяскоўцаў.

У царкве Раства Прасвятой Багародзіцы створана нядзельная школа. Настаяцель царквы айцец Мікалай ахвотна расказвае, як некалькі гадоў таму агульнымі намаганнямі ствараласяся гэта ўнікальная клумба, якую сёння з задавальненнем даглядаюць дзеці.

Вясковы храм 1647 года аднесены да гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. Яго днямі наведала 25-я міжнародная навукова-творчая экспедыцыя «Дарога да святыняў». Мясцовыя абразы здзіўляюць сваёй выяўленчай сувяззю з роднай вёскай: каля ног Маці Божай намалёваны клубніцы (іх вырошчваюць усе тутэйшыя гаспадары), а на далоні святога ўтульна размясцілася апекаваная Богам і людзьмі вясковая царква.

Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.

❍ ДА ТЭМЫ

ГЕОГЛІФАМ завецца нанесены на паверхню зямлі геаметрычны або фігурны малюнак памерам звыш чатырох метраў. Чалавек ствараў геогліфы ў розныя часы сваёй гісторыі.

На ўскраіне вёскі ёсць яшчэ адзін унікальны геогліф — высаджаныя дрэвы ў форме слова ЛЕНІН. За паўстагоддзя з часу пасадкі гэты надпіс стаў амаль незаўважным — літары зараслі новым, маладым лесам. Лясны геогліф адыходзіць у мінулае — гэта факт нашай агульнай гісторыі.

Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 8 октября 2018 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 311/С-35880** общей площадью **235,2 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **учрежденческое здание. Капитальное строение с инв. № 311/С-32213** общей площадью **59,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад ГСМ. Капитальное строение с инв. № 311/С-1035** общей площадью **542,2 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **гараж. Капитальное строение с инв. № 311/С-1034** общей площадью **46,9 кв. м,** назначение – здание нежилое, наименование – **бытовка. Капитальное строение с инв. № 311/С-1038** общей площадью **45,6 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **мастерская. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100001003512** общей площадью **0,4645 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, пер. Крылова, 4. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания учрежденческого здания, здания гаража, бытовки, мастерской, склада ГСМ	**134 520,00**	6 726,00	13 452,00
2	**Капитальное строение с инв. № 311/С-1032** общей площадью **281,3 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж. Капитальное строение с инв. № 311/С-1043** общей площадью **61,4 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **здание проходной. Капитальное строение с инв. № 311/С-1041** общей площадью **893,8 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **здание столярно-пилорамного цеха. Капитальное строение с инв. № 311/С-1039** общей площадью **73,6 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **РБУ. Капитальное строение с инв. № 311/С-1037** общей площадью **99,2 кв. м,** назначение – здание специализированное лесохозяйственного назначения, наименование – **лесосушилка. Капитальное строение с инв. № 311/С-1036** общей площадью **499,8 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад. Капитальное строение с инв. № 311/С-1040** общей площадью **47,7 кв. м,** назначение – здание нежилое, наименование – **бытовка.** **Капитальное строение с инв. № 311/С-1033** общей площадью **114,5 кв. м,** назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – **арматурный цех. Капитальное строение с инв. № 311/С-34650** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение благоустройства, наименование – **забор вокруг базы ПМК-95** (сооружение забора вокруг базы ПМК-95 протяженностью 585,72 м). Недвижимое улучшение – **асфальтобетонная площадка (полигон ж/б изделий)** (без учета пропарочной камеры). Недвижимое улучшение – **ворота. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100001003513** общей площадью **2,3313 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, пер. Крылова, 4. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания проходной, бытовки, столярно-пилорамного цеха, лесосушилки, гаража, РБУ, склада, арматурного цеха, уборной, ворот и асфальтобетонной площадки(полигон ж/б изделий)	**267 720,00**	13 386,00	26 772,00
3	**Капитальное строение с инв. № 311/С-34652** общей площадью **56,5 кв. м,** назначение – погреб, наименование – **погреб. Капитальное строение с инв. № 311/С-1044** общей площадью **185,4 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100001000216** общей площадью **0,3392 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, пер. Крылова, 4. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для обслуживания производственной базы	**40 920,00**	2 046,00	4 092,00

Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости, Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY34 BAPB 3012 2093 7001 3000 0000, БИК BAPBBY2X, ОАО «Белагропромбанк», УНП 400071204, ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 5 сентября 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 4 октября 2018 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения.**

Для участия в аукционе предоставляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

